№ 18 (759) 16 мая 2012

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА

# Наша Ніва

www.nn.by

П Е Р Ш А Я ... А Р У С К А Я Г А З Е ...

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адно... Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва...



## Што будуецца на прэзідэнцкай трасе?

Сталічны праспект Пераможцаў — суцэльная будпляцоўка. Старонка 5.



## Фальшывыя ветэраны

Некаторыя абвешаныя медалямі «ветэраны ВАВ» ніколі не былі на фронце. Старонка 9.

# Рыгор Барадулін: «Вы — неўміручыя»



Выйшла **кніга-гутарка** з народным паэтам Беларусі. **Старонка 11.**

**Тэндэнцыі**

## Пяць фактаў пра міністра Шуневіча

Анатоля Куляшова ў МУС замяніў **выхадзец з КДБ**.

**1. Не з Беларусі**

Кіраўнік Беларусі праціягвае палітыку прызначэння на ключавыя сілавыя пасады ўраджэнцаў не Беларусі, а сумежных дзяржаваў.

Ігар Шуневіч нарадзіўся ў Луганскай вобласці. Значыць, кандыдатам на пасаду прэзідэнта па заканадаўстве ён быць не можа. Экс-міністр Куляшоў нарадзіўся ў Азербайджане, а ягоны папярэднік Уладзімір Навумаў — у Смаленскай вобласці.

Ва Украіне прыйшлі на свет цяперашні і папярэдні старшыні КДБ Вадзім Зайцаў і Юры Жадобін (сёння — міністр абароны). З Расіі кіраўнік лукашэнкаўскай службы бяспекі Андрэй Уцюрын. Уручанскім спецназам камандуе Хазалбек Атабекаў. Нават міністрам МНС прызначаюць ураджэнца Рэспублікі Комі Уладзіміра Вашчанку, да гэтага быў зямляк Куляшова Энвер Барыеў. На Шуневічу гэтая тэндэнцыя працягнулася.

**2. Свой для КДБ ці МУС?**

Шуневіч пачынаў сваю кар'еру ў органах МУС. Скончыў міліцэйскую акадэмію. Служыў на розных пасадах у органах МУС. Потым у 2007 быў прызначаны ў КДБ, дзе ўзначальваў галоўнае ўпраўленне контрвыведачнага забеспячэння праваахоўных і кантралюючых органаў, барацьбы з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю.

**Працяг на старонцы 3.**

**Палітыка**

### Хто можа замяніць Макея?

Ходзяць размовы пра адстаўку. **Старонка 3.**



**Спорт**

### Не выканалі «наказ партыі»

Яшчэ адна шайба ў нашай браме. **Старонка 8.**



**Грамадства**

### «Прадаць радзіму можа кожны»

Для чаго існуюць моладзевыя атрады БРСМ? **Старонка 6.**



**Тролі**

### «Застабілы, як твой муж, павінны здохнуць»

Гамяльчук трапіў у інтэрнэт-скандал. **Старонка 6.**



## Дык падпісвайся!

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Мінчукі супраць будаўніцтва манастырскага выставачнага цэнтра БПЦ

Дазвол на ўшчыльненне даў **асабіста Лукашэнка**.

Мінчукі з вуліцы Выгоцкага, што ў былым пасёлку Навінкі, сутыкнуліся з «ушчыльненнем». Бетонныя скрынкі падбіраюцца да жылых дамоў упрытык. Знаёмая гісторыя? Але ёсць у гэтага канфлікту асаблівасць. Квартал у Навінках «захапіў»... праваслаўны манастыр.

Усё пачалося з «каплічкі». Некалькі гадоў таму, калі ў пачатку вуліцы Выгоцкага яшчэ працаваў міні-рынак, святары звярнуліся да грамадзян з прапановай пабудаваць у раёне невялікую цэркаўку. Людзі з радасцю пагадзіліся. На календары-2012 тую каплічку ўжо і не адшукаць. Комплекс збудаванняў Свята-Елісавецінскага манастыра ператварыўся ў сапраўдны царкоўны мініполіс.




Каля дома №1 на вуліцы Выгоцкага сядзяць пенсіянеркі. Па невялікай вулачцы, побач з дзіцячай пляцоўкай, едуць машыны. Адна, другая. Сярод іх уседарожнік. «Бацюшкі тут «лётаюць» на такіх хуткасцях, што ўнукаў баімся на вуліцу адпускаць, — кажа адна з бабулек. — Дапамогі прасіць няма ў каго. Чыноўнікі заплюшчваюць вочы. Манашкі нешматслоўныя: «На ўсё воля Божая».

Манастырскі комплекс разросся. Тут і храм, і жылая частка з келлямі. Тут жа гаспадарчыя карпусы, капліцы, кацельні, трансфарматарная і помпавая станцыі... Будаўніцтва не завершана. Над кварталам узвысіцца надбрамная званіца вышынёй больш за 40 метраў.

«Тут калісьці быў міні-рынак, — кажуць жыхары. — А потым санстанцыя яго выселіла». Цяпер на пляцоўцы разгружаюць фуры. Манастыр прадае свініну... Гандаль ідзе бойка. Нядаўна адкрылася кавярня «Цуд-Млын», ёсць некалькі царкоўных крамак, прадаюць квас.

Па сутнасці, гэта асобны квартал, які жыве сваім уласным ўтульным жыццём. Але суседскія адносіны з царкоўным гарадком у свецкіх не склаліся. Летась манастыр пачаў будаўніцтва яшчэ двух аб'ектаў: Дома паломнікаў і нядзельнай школы. «Нам казалі, што будынкі будуць двухпавярховымі, але ўжо вымалёўваецца паверхаў пяць. Жылы двор скараціўся да мінімуму. Далей — больш. Пад вокнамі дома №1 будаўнікі капаюць катлаван пад будаўніцтва манастырскага «выставачнага цэнтра». «Усе дрэвы высеклі, — кажа прадстаўніца ініцыятыўнай групы Ірына. — Калі мы пыталіся ў манастыры, што ж гэта такое вы робіце, нам сказалі: «Гэта не ваша зямля, а Божая».

«У каго з работнікаў выканкама падымецца рука не ўзгадніць нешта для царквы? — кажа жыхарка дома Ала Аляксандраўна. — Па сутнасці, мы назіраем звычайны бізнэс пад крыжам». У апошнім сваім звароце на імя Лукашэнкі абураныя жыхары напісалі: яны адмаўляюцца ўдзельнічаць у сёлетніх парламенцкіх выбарах.

«Мы ўсё робім згодна з заканадаўствам. Атрыманыя ўсе патрэбныя дакументы, — коратка пракаментавалі ў аддзеле будаўніцтва манастыра. — А дазвол на праектаванне корпуса паломнікаў, выставачнага цэнтра і нядзельнай школы даваў асабіста Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Каб не атрымліваць зямлю па аўкцыёне, мы звярнуліся да яго. Бо вышэй, чым прэзідэнт, у нашай краіне нікога няма».

**Паводле Realt.onliner.by**

## Выходзіць «Вялікі слоўнік беларускай мовы» на 223 000словаў

Камп'ютарнік **Хведар Піскуноў** складаў яго 12 гадоў.

У яго трапіла і лексіка апошніх дзесяцігоддзяў, і тыя старыя словы, якія раней не фіксаваліся слоўнікамі.

«Я аддаў на стварэнне слоўніка 12 год, а па факце — палову жыцця, — кажа ўкладальнік. — Гэта, можна сказаць, два слоўнікі адначасова — звычайны і граматычны — у яго ўваходзіць болей за 300 табліц. Я апрацоўваў, у тым ліку, літаратуру 20-х, 30-х гадоў, шмат святарскай лексікі. У слоўніку каля 223 000 словаў. Крыніцы для слоўніка камп'ютарнік Піскуноў апрацоўваў электронна.

«Для мяне важна зламаць стэрэатып: «калі такога слова няма ў слоўніку, значыцца, яго не існуе». Гэта ж такім заганным правілам карыстаецца большасць рэдактараў. А гэта вялікая шкода для мовы» — лічыць ён.

Мовазнаўца Сяргей Запрудскі слоўнік хваліць: «Важна, што ён ствараўся пры дапамозе базы, а не картатэкі. Гэта сапраўдная альтэрнатыва афіцыйным слоўнікам».

У апошнім акадэмічным «Слоўніку беларускай мовы», які ўклаў Інстытут мовы і літаратуры Акадэміі навук, каля 150 тыс. словаў.

Хведар Піскуноў, фактычна, адзін зрабіў працу, параўнальную з высілкамі цэлага інстытута.

**Юрась Ускоў**



**Хведар Піскуноў**
Інжынер, які прысвяціў жыццё беларускай лексікаграфіі. Скончыў хімічны факультэт БДУ (1971). Стваральнік лінгвістычнай часткі праграмы праверкі беларускай арфаграфіі «Літара» (2004), электроннага слоўніка беларускай мовы «Парадыгма» (2009).

# Не забудзьцеся падпісацца!

**Падпіска праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 15000 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 4 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

**Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.**

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г. Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты:**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. №539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

**Падпіска праз «Белпошту»**

**Падпіска праз «Белпошту»** на 2-е паўгоддзе:

індывідуальная падпіска (індэкс у каталозе — 63125) — 15040 руб./месяц;

для прадпрыемстваў (індэкс — 631252) — 18045 руб./месяц.

Падпісацца можна на кожнай пошце.

### Бывае

**Чарговы канфуз Януковіча**

З украінскім прэзідэнтам Віктарам Януковічам адбыўся чарговы выпадак. На 9 Мая Януковіч чытаў сваю прамову з паперкі і няправільна расставіў паўзы ў тэксце. Звяртаючыся да ветэранаў, ён сказаў: «Вы прайшлі праз пекла вайны (паўза) з фашызмам да канца выконвалі свой абавязак перад радзімай». У выніку замест фразы «вы прайшлі праз пекла вайны з фашызмам» стварылася ўражанне, што ветэраны разам з фашыстамі «да канца выконвалі свой абавязак».

### Глядзіце

**«Дарма, Шура, ты сюды вярнуўся»**

Аляксандр Лукашэнка зноў стаў героем «Мульта асобы» на расійскім Першым канале. Гэтым разам ён парадыйна ўзначаліў каманду знаўцаў у «Што? Дзе? Калі?». Глядзі відэа на NN.BY.

### Сціслa

**Дзмітрый Лукашэнка ляціць у Кемерава**

16 мая ў Кемераўскую вобласць прыедзе сын кіраўніка Беларусі Дзмітрый Лукашэнка. Ён наведае будоўлю і вугальны разрэз. Дзмітрый займае пасаду старшыні Цэнтральнай рады Прэзідэнцкага спартовага клуба. На разрэзе «Чарнігавец» ён паўдзельнічае ў запуску першага ў Расіі экскаватара, абсталяванне якога дазваляе рабіць дыстанцыйную перадачу дадзеных.

**Ажубаліс пра альтэрнатыўны цэнтр улады для Беларусі**

Аўдронюс Ажубаліс у інтэрв'ю няўрадавай арганізацыі Carnegie Europe паведаміў пра ідэю «радыкальнага рашэння» беларускага пытання.

«Апазіцыя падзеленая. У яе няма яснай пазіцыі ў справе падрыхтоўкі да наступных выбараў, — сказаў Ажубаліс. — Я бачу адзін, даволі радыкальны спосаб. Разам з нашымі амерыканскімі сябрамі нам трэба пачаць думаць пра нейкую пераходную раду. Трэба стварыць альтэрнатыўны цэнтр улады. Гэткая паралельная структура магла б мець розгалас у самой Беларусі. Вось такая ідэя. Але пакуль што з Брусэля няма ніякай рэакцыі».

**Чыстыя Пруды разгоняць**

Басманны суд Масквы пастанавіў ліквідаваць лагер апазіцыі на Чыстых Прудах, які знаходзіцца там з 8 мая. Расійская апазіцыя, аднак, не мае намеру спыняць сваю акцыю. «Нельга забараніць людзям збірацца ў скверах, парках і на бульварах», — сказаў адзін з лідараў пратэсту Ілля Яшын.

**Затрымалі жанчыну з чырвоным сцягам**

Вядомая мінчанка Людміла Калантай 9 Мая не змагла дайсці да помніка Перамогі. Яна знакамітая тым, што на савецкія святы адзявае пунсовы берэт і такога ж колеру паліто і з чырвоным сцягам шпацыруе па цэнтральных вуліцах Мінска. Аднак сёлета яе спыніла міліцыя і вывезла на машыне. Праўда, разабраліся і праз 15 хвілін адпусцілі.

**СГ**

**Самае чытанае на nn.by за 9—15 мая**

1. «Міс грудзі — 2012» — выкладчыца БНТУ з 6-м памерам грудзей — фота
2. У парадах на 9 Мая бяруць удзел фальшывыя ветэраны — фотафакт
3. Міс Грудзі — за кулісамі шоу. Жорсткія фоты Антона Матолькі
4. Лукашэнка: Няма нічога больш невыноснага за свабоду
5. Пасланне Лукашэнкі ў асобах — фота
6. Сотні карыстальнікаў аб'явілі байкот «Укантакце»
7. «Дарма, Шура, ты сюды вярнуўся» — Лукашэнка зноў герой «Мульта»
8. У Мінску 9 Мая затрымалі знакамітую жанчыну з чырвоным сцягам
9. Міліцыя шукае графіцістаў, якія дзёрзка размалявалі электрычку
10. Яшчэ адзін фальшывы ветэран — энкавэдыст з «сямю ордэнамі Леніна»

# Пяць фактаў пра міністра Шуневіча

Працяг са старонкі 1.

Як чалавек, для якога абодва ведамствы не чужыя, Шуневіч казаў, што не існуе ніякай вайны паміж МУС і КДБ. «Такога факта не існуе, а ўсе размовы — інтрыгі», — казаў Шуневіч. Дарэчы, і яго пераход адбываўся ў самы разгар канфліктаў між сілавікамі, напярэдадні разгортвання «паляўнічай справы».

У КДБ Шуневіча называлі даверанай асобай Зайцава. Праўда, праз нейкі час з'явілася інфармацыя пра арышт за хабар блізкага супрацоўніка Шуневіча, але пацвярджэння яна не атрымала.

### 3. «Гутарыў» з палітвязнямі

Неаднаразова казалі, што ў сваёй працы Шуневіч кантраляваў унутраную турму КДБ—«Амерыканку». Пэўныя пацвярджэнні знайшліся нядаўна. Вось, напрыклад, што згадвае пра сваё знаходжанне ў вязніцы рэдактарка «Хартыі-97» Наталля Радзіна.

«Ігара Шуневіча я ўбачыла ўпершыню ў сярэдзіне студзеня ў турме КДБ. Мяне выклікалі да яго на допыт ужо пасля адбою ў 22.00. Фармальна гэта быў не допыт, а «размова», бо праходзіла яна без адваката.

Шуневіч адразу заявіў, што «ўжо вербаваць ён мяне дакладна не збіраецца». І наогул, адзначыў ён, праца сайта charter97.org цікавіць следчых КДБ, а яго цікавяць «значна больш сур'ёзныя рэчы». Цікавілі яго зусім неймаверныя рэчы: сувязі кандыдатаў у прэзідэнты з Польшчай, Германіяй і суседнімі Расеяй і Украінай. Дапытваючы, Шуневіч сказаў, што ўжо «гутарыў» з Саннікавым і Халіп».

### 4. Міністр праз чатыры месяцы

«Я думаю, што ваш досвед, які вы набылі ў КДБ, вельмі карысны, але наогул вы — прафесійны спецыяліст Міністэрства ўнутраных спраў, ведаеце яго знутры. Але самае галоўнае — праца ў КДБ (а ў апошні час вы як раз займаліся кантролем працы праваахоўных органаў) дала вам магчымасць убачыць знутры ўсе праблемы МУС», — сказаў Лукашэнка, прызначаючы Шуневіча першым намеснікам Куляшова. Каб заняць крэсла міністра, Шуневічу хапіла чатыры месяцаў працы.

«Шуневіч быў ндрэнным прафесіяналам і начальнікам, калі ўзначальваў следчае ўпраўленне КДБ. Як толькі патрапіў у палітычную сістэму, у «абойму» — адразу пачаў выконваць палітычны заказ. Палітычны заказ па Байковай, па «паляўнічых». Таму я перакананы: Шуневіча чакае такая ж «перспектыва», як Полудня і Пякарскага», — лічыць былы супрацоўнік КДБ Валер Костка.

**Куляшоў: Трэба своечасова звяртацца да дактароў**

Журналісты «Народнай волі» датэлефанаваліся да экс-міністра, аднак гаварыць ён быў не настроены. Адзінае, што сказаў: «Каб у будучыні не ўзнікала сур'ёзных праблем са здароўем, трэба своечасова звяртацца да дактароў».

Выданне піша, што ў Куляшова быў дыягнаставаны рак. Прычым, зусім не на ранняй стадыі. Чыноўнік нават перанёс некалькі аперацый.



Ігар Шуневіч (у цэнтры): чалавек са сціснутымі вуснамі.

### 5. Рэформа ў МУС

Звяртаючыся да народа і парламента ў аўторак, Лукашэнка адзначыў, што сёлета будзе скончаная рэформа МУС. Пэўныя рэчы ўжо былі зробленыя, калі з розных сілавых ведамстваў аддзяліўся і зажыў паўнавартасна Следчы камітэт. Відаць, будучыя пераўтварэнні лягуць на плечы Шуневіча.

Ён прыйшоў у МУС не ў самы лепшы час для міністэрства. Арыштаваны па абвінавачванні ў перавышэнні службовых паўнамоцтваў намеснік міністра Яўген Полудзень, за «дыскрэдытуючы» ўчынак звольнены першы намеснік Алег Пякарскі. Відавочна, што на наступнай сустрэчы з Шуневічам Лукашэнка будзе казаць, што яму неабходна вярнуць станоўчы імідж і давер да міліцыі. Задача, проста скажам, не з лёгкіх.

ЗП

# Хто можа замяніць Макея?

Ужо не першы месяц ходзяць размовы пра магчымую адстаўку кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея.

Чалавек, што займае гэтую пасаду, адзін з найбліжэйшых да кіраўніка краіны. «Беларускі партызан» нават адзначаў, што толькі кабінет Макея знаходзіцца на адным паверсе з Лукашэнкавым.

У 2008 прызначэнне Макея ўспрымалася з пэўным энтузіязмам. Вядома, замяняў ён Віктара Шэймана, чыё імя звязвалі са справаю Захаранкі—Ганчара.

Якраз на перыяд пасля прыходу Макея прыпала «адліга». Пачалася лібералізацыя эканомікі, сцішылі паляванне на ведзьмаў, з турмаў выйшлі палітвязні. Нармалізаваліся адносіны з Еўрасаюзам, Мінск з візітамі наведалі Берлусконі і Грыбаўскайце. Усё гэта звязвалася з імем Уладзіміра Макея. Нават ахрысцілі ягоную каманду «галубамі», у процівагу шэйманаўскім «ваўкам».

Потым было 19 снежня. Пасля якога Макей яшчэ спрабаваў па старых сувязях звязацца з еўрапейскімі кіраўнікамі. Прынамсі, пра гэта казаў яго нямецкі калега Рональд Пофала.

Сёлета Макей неаднаразова адзначаўся рэзкімі заявамі адносна санкцый і лёсаў палітвязняў. Стала зразумела, што Макей зусім не «голуб», а прosты Маўчалін.


У Снапкова добрыя стасункі з Віктарам Лукашэнкам.



Валянцін Рыбакоў з Уладзімірам Макеем з «аднаго гнязда».

Цяпер чарговы раз загаварылі пра нармалізацыю адносінаў з Еўропай. Відаць, для гэтай місіі давядзецца шукаць іншага чалавека. Хто можа замяніць Макея?

### Валянцін Рыбакоў

Сам Макей прыйшоў у крэсла кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта з пасады памочніка прэзідэнта. Калі паглядзець на сённяшніх памочнікаў, то са спіса вылучаюцца трое: Рыбакоў, Пяткевіч і Лукашэнка. Маецца на ўвазе Віктар Лукашэнка.

Наталля Пяткевіч ужо мае досвед працы ў Адміністрацыі. Нейкі час яна была намеснікам Макея. Вяла за філіжанкай кавы перамовы з прадстаўніком Дзярждэпа ЗША Крэймерам. Але Пяткевіч невыязная ў ЕС і ЗША, таму перамовы весці ёй будзе складана. Унутры краіны яна таксама нажыла ворагаў ці, прынамсі, скептыкаў у часе сваёй працы намесніцай кіраўніка Адміністрацыі.

Кар'ерны шлях Валянціна Рыбакова нечым нагадвае прыход Макея. Таксама дыпламат, скончыў Лінгвістычны. Працаваў паслом па асаблівых даручэннях. Ад 2006 памочнік Лукашэнкі. Прычым, на публічныя ролі асабліва ніколі не выходзіў. Зусім як Макей у свой час.

Былыя калегі Рыбакова кажуць, што «ён з Макеем аднаго поля ягады». Адзначаецца, што Рыбакоў выдатны перакладчык, што лёгка тлумачыць шлях да кіраўніка краіны.

Нядаўна сайт WikiLeaks надрукаваў з дзясятак дэпеш, дзе ўзгадваецца імя Рыбакова. Менавіта праз яго ішлі кантакты афіцыйнага Мінска з пасольствам ЗША. Не выключана, што такія ж кантакты ён мог мець і з еўрапейцамі.

Апроч таго, апошнім часам некалькі разоў Рыбакоў з'яўляўся з публічнымі заявамі. Раней жа аддаваў перавагу заставацца ў цяні. Калі такая замена адбудзецца, то будзе хутчэй тэхнічнай.

Зрэшты, не варта адкідваць магчымасці прызначэння і цяперашняга памочніка па бяспецы Віктара Лукашэнкі.

### Мікалай Снапкоў

Падчас звароту Лукашэнкі да народа і парламента можна было звярнуць увагу, што побач з Віктарам Лукашэнкам сядзеў міністр эканомікі Мікалай Снапкоў. Тады як астатнія міністры сядзелі асобна.

Снапкоў з Магілёва. Ён працаваў бухгалтарам і эканамістам на невысокіх пасадах у Дрыбінскім і Горацкім раёнах. Потым набіраўся досведу ў аблвыканкаме. У 2009 яго пераводзяць у Адміністрацыю прэзідэнта. А праз пару месяцаў робяць міністрам эканомікі замест пенсіянера Зайчанкі.

Пісалі, што Снапкоў і Віктар Лукашэнка жанатыя на родных сёстрах.

Незалежныя аналітыкі называюць Снапкова прынцыповым «рыначнікам» ва ўрадзе Мясніковіча.

Снапкоў нарадзіўся ў 1969. Да гэтага ўсе кіраўнікі Адміністрацыі (іх было шасцёра) былі з аднаго пакалення, народжаных у 1950-я.

Снапкоў з часам можа дарасці да прэм'ер-міністра, аднак гэтая дарога можа ісці і праз Адміністрацыю — калі начальнік дзяржавы палічыць патрэбным зрабіць галоўным кадравіком спецыяліста па рынку.

### Радзькоў, Тур

Тасаваннем абоймы можна было б назваць замену Макея на некага з яго ных намеснікаў. Хай гэта будзе Аляксандр Радзькоў. Кіраўнік «Белай Русі» і арганізатар збору подпісаў за Лукашэнку на выбарах 2010 года.

Калі Радзькоў займаў пасаду міністра адукацыі, пры ім спынілася выкладанне гісторыі Беларусі на беларускай мове, затое за палітыку масава выганялі з універсітэтаў. Зрэшты, Радзькоў ніколі не вылучаўся незалежнасцю ў прыняцці рашэнняў.

Дый не самы прадстаўнічы Радзькоў, як і Андрэй Тур, аўтар славутага «Дружышча, ты жывеш не па сродках». Тур мае рэпутацыю «флюгера», які дзейнічае толькі па загадзе зверху.

### Вадзім Зайцаў

Калі скакаць ад печкі не Еўрасаюза, а Расіі, то наша ўсходняя суседка, відаць, станоўча ўспрыняла б прызначэнне ў Адміністрацыю старшыні КДБ Вадзіма Зайцава. Гэтага ўжо дакладна не абвінавачіш у беларускім нацыяналізме і праеўрапейскіх сімпатыях. Зайцаў у спісе неўязных на тэрыторыю ЕС займае адзін з першых радкоў.

### Рачкоўскі і Даўгалёў

Калі прайсціся па сілавіках, то варта адзначыць яшчэ ўсмешлівага кіраўніка памежнага камітэта Ігара Рачкоўскага, яшчэ аднаго пратэжэ Віктара Лукашэнкі. Быць памежнікам цяпер у модзе.

Сваталі ў Адміністрацыю прэзідэнта і яшчэ аднаго ветэрана беларускай палітыкі — былога пасла Беларусі ў Расіі Васіля Даўгалёва. Праўда, ён нядаўна атрымаў крэсла ў «Белгазпрамбанку».

Зміцер Панкавец

# «Гаворым многа, а толку мала»

**Пасланне Лукашэнкі было прымірэнчым: што гэта значыць?**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**На выступ Лукашэнкі запрасілі паслоў Еўрасаюза. У адрозненне ад мінулага года, яны таксама былі запрошаныя на плошчу Перамогі 9 Мая. На фота: пасол Нямеччыны Крыстаф Вайль і прадстаўніца Еўрасаюза Майра Мора.**

Сёлета да рэкорду прамова недацягвала. Зварот доўжыўся ўсяго дзве гадзіны. Пасля Лукашэнка, седзячы, яшчэ паўтары гадзіны адказваў на пытанні дэпутатаў.

Пасланне адкладалася з красавіка. Паставілі яго паміж інаўгурацыяй Пуціна ў Маскве і Днём Перамогі.

А вось тон Лукашэнкі зусім не быў ваяўнічым, хутчэй наадварот — прымірэнчым. Што да адносінаў з Еўрапейскім саюзам і ЗША, то быў прапанаваны дыялог. Праўда, ужо праз пару дзён кіраўніца прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Мінску Майра Мора зазначыла, што дыялог магчымы толькі пры вызваленні ўсіх палітвязняў.

На гэта Лукашэнка чарговы раз нагадаў пра амністыю да 3 Ліпеня. Увогуле ж, пра «адмарозкаў» і «пятую калону» ў звароце было па мінімуме.

Таксама па мінімуме Лукашэнка гаварыў і пра Расію. Вядома, інтэграцыя ў рамках Мытнага і Еўразійскага саюза добра. Але была агучаная ідэя «інтэграцыі інтэграцый». Гэта даволі касмічны праект збліжэння Еўрапейскага і Еўразійскага саюзаў. Касмічны, бо немагчыма інтэграваць супольнасць дэмакратычных краін з саюзам аўтакратый.

Прыярытэтным жа быў названы кітайскі вектар. Словы «Кітай», «кітайскі» з вуснаў зляцелі 30 разоў — больш, чым «Еўропа». Толькі вось ЕС згадваўся ў асноўным негатыўна, а Кітай толькі пазітыўна.

Зноў была агучаная «свяшчэнная місія» сярэдняга 500-даляравага заробку. Лукашэнка даў указ ураду да канца года давесці паказчыкі да гэтай лічбы.

Шмат гаварылася і аб прыватызацыі. Лукашэнка сказаў, што гатовы прадаваць усе прадпрыемствы, але па прымальным кошце. Калі перакладаць гэта на звычайную мову, то пакуль прыватызацыя буйных прадпрыемстваў не плануецца. Гэтым самым даў зразумець, што сітуацыя з эканомікай нармалізавалася.

Лукашэнка цытаваў Дастаеўскага, што «няма нічога больш невыноснага за свабоду». А таксама выказаў пажаданне, каб ў хаце кожнага беларуса быў слуцкі пояс.

**Зміцер Панкавец**

**Афарызмы ад Лукашэнкі**

Мы стварылі ўнікальную дзяржаву. Прыгожую, зялёную, дзе людзі жывуць.

Я чую кожны піск у любым кутку Беларусі. Ён праходзіць праз маё сэрца.

Так, як яны гуляюць, дык лепш бы ў нас гэтага чэмпіянату не было. [Пра хакеістаў — «НН».]

# «Са словамі Дастаеўскага Лукашэнку падставілі»

**Іван Карамазаў — увасабленне сілаў зла. Ён практычна забівае свайго бацьку і канчае вар'яцтвам.**

Падчас свайго звароту да парламента і народа Аляксандр Лукашэнка працытаваў словы расійскага пісьменніка Фёдара Дастаеўскага. «Няма для чалавека нічога больш невыноснага за свабоду». «Геніяльны пісьменнік меў рацыю — атрымліваючы свабоду, чалавек разумее, што ўзваліў на сябе цяжкую ношу: свабода прадугледжвае адказнасць, чалавек сам прымае рашэнні і сам за іх адказвае», — перасцерагаў ён.

Што могуць азначаць гэтыя словы з вуснаў Лукашэнкі? Ці вы згодныя, што беларусы не гатовыя да свабоды?

**Святлана Алексіевіч, пісьменніца:** Так мог сказаць толькі турэмшчык альбо наглядчык. Маўляў, народ не варты свабоды. Вы не вартыя, бо я вас прыручыў, я вам усё даю. А самі вы не можаце прымаць рашэнні. Гэтыя словы дэманструюць непавагу да нацыі.

**Аляксандр Кулінковіч, саліст гурту «Нейра Дзюбель»:** Ён проста прачытаў прыгожую фразу, якую ўключыў у сваё выступленне. Наўрад ці ён сапраўды думае пра свабоду.

**Наталка Бабіна, пісьменніца:** Гэта сумнеўнае цытаванне размовы паміж братамі Аляксеем і Іванам з «Братоў Карамазавых». А словы ўкладзены ў вусны апошняга. Як памятаем, Іван — герой неадназначны, ён вінаваты ў цэлым ланцугу кепскіх справаў і дзеянняў. Тыя, хто піша Лукашэнку прамовы, падставілі яго. Іван у рамане — у пэўным сэнсе ўвасабленне сілаў зла. Ён практычна забівае свайго бацьку і канчае вар'яцтвам. Вось такі чалавек гаворыць пра невыноснасць свабоды, але зусім не Дастаеўскі.

**Сяргей Макарэвіч**

# Лукашэнка і Назарбаеў паехалі ў пушчу, каб іх не праслухоўвалі?

**Перад самітам СНД Беларусь наведаў прэзідэнт Казахстана.**

Нефармальныя перамовы кіраўнікоў краін адбыліся 12–13 мая ў рэзідэнцыі Віскулі ў Белавежскай пушчы.

Ініцыятыва прымання госця ў Віскулях сыходзіла ад Лукашэнкі. «Мы мелі магчымасць абмеркаваць шмат пытанняў, і я ўдзячны вам за тое, што вы прыехалі паглядзець Белавежскую пушчу — гэты ўнікальны аб'ект», — адзначыў Лукашэнка.

Нурсултан Назарбаеў заявіў, што ён «захоплены выхаднымі, што правялі разам»: «Я ўпершыню наведаў выдатны куток нашай планеты. Беларусь для нас — стратэгічны партнёр, блізкі сябар і саюзнік. У нас вялікія чаканні ад Мытнага саюза, АЭП, што яшчэ больш зблізіць нашы краіны. Бліжэйшых саюзнікаў, чым Расія, Беларусь і Казахстан, на постсавецкай прасторы няма».

Выказваецца меркаванне, што Лукашэнка і Назарбаеў маглі схавацца ў Белавежскай пушчы, каб пазбегнуць любога праслухоўвання.

Гаварыць жа маглі як пра перспектывы краін у Мытным і Еўразійскім саюзах, так і пра магчымасць паставак у Беларусь казахскіх энергарэсурсаў, якія раней блакаваліся Масквой.

**ЗП**

# Вясковыя прадпрымальнікі атрымалі падатковыя льготы

**Сем гадоў яны змогуць працаваць без падаткаў.**

Ствараць бізнэс у вёсках і малых гарадах стане выгадна. Гэта вынікае з дэкрэта № 6 «Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці», падпісанага Аляксандрам Лукашэнкам 7 мая. Згодна з ім, ІП-шнікі і камерцыйныя арганізацыі, якія працуюць на вызначанай тэрыторыі, вызваляюцца ад некаторых плацяжоў на працягу сямі гадоў з дня іх дзяржаўнай рэгістрацыі.

Напрыклад, для іх адмяняецца падатак на прыбытак і падаходны падатак з даходаў, атрыманых ад рэалізацыі тавараў і паслуг уласнай вытворчасці. Апроч таго, не трэба будзе плаціць падатак на нерухомасць, пошліну за выдачу ліцэнзіі на дзейнасць, а таксама прадаваць валютную выручку і адлічваць грошы ў інавацыйныя фонды.

«Гэта адзін з найлепшых дакументаў за час кіравання Лукашэнкі, — пракаментаваў дэкрэт эканаміст Яраслаў Раманчук. — Галоўнае, што з'явіўся попыт на эканамічную свабоду і прыватнае прадпрымальніцтва. Лукашэнка будзе рабіць, як кітайскія камуністы: гаварыць пра сацыялізм, а насамрэч стымуляваць развіццё механізмаў свабоднага рынку».

**ЯМ**

# Наваполацкая кампанія «Інтэрсэрвіс» стане трэцім НПЗ Беларусі

**Мясцовы мільянер Верабей бясплатна атрымаў завод балансавым коштам $7 мільёнаў.**

Адзін з прыватных беларускіх нафтатрэйдараў, наваполацкі «Інтэрсэрвіс», атрымае ва ўласнасць комплекс «Наваполацкага завода БВК», аднаго з найбуйнейшых на тэрыторыі былога СССР вытворцы бялкова-вітамінных канцэнтратаў, для стварэння нафтаперапрацоўчай вытворчасці. Гэта вынікае з прэзідэнцкага ўказа № 226.

На базе завода да пачатку 2021 будзе створана вытворчасць па перапрацоўцы нафты і іншай вуглевадароднай сыравіны магутнасцю 1,5 мільёна тон у год і тэрмінал такой жа магутнасці па захоўванні і пераналіве сыравіны і нафтапрадуктаў. Таксама «Інтэрсэрвіс» і створанае прадпрыемства павінны ўнесці $270 мільёнаў інвестыцый для рэалізацыі гэтага праекта.

Уладальнікам кампаніі, якая займаецца перапрацоўкай татарскай нафты на магутнасцях Наваполацкага НПЗ, з'яўляецца мясцовы мільянер Мікалай Верабей. Ён уваходзіць у топ-100 самых паспяховых беларускіх бізнесменаў. Мае ўласнасць у дрэваапрацоўцы «Інтэрфорэст», розлічным гандлі і грамадскім харчаванні, валодае аўтарамонтным бізнэсам («Аўтаімпарт»). Хмары над Вераб'ём згушчаліся ў 2007, калі быў арыштаваны дырэктар «Белнафтахіма» Аляксандр Бароўскі і сілавыя структуры ўшчыльную заняліся ўдзельнікамі нафтарынку.

**Ягор Марціновіч**

# Што будуецца на прэзідэнцкай трасе?




**Сталічны праспект Пераможцаў — суцэльная будпляцоўка.**

Паркавая магістраль, праспект Машэрава, праспект Пераможцаў — адна з галоўных дарог Мінска. Вакол яе будуецца элітнае жыллё, непадалёку знаходзяцца і катэджы вышэйшых чыноўнікаў. Па праспекце Пераможцаў штодня едзіць прэзідэнцкі картэж, таму дарогу даглядаюць дзясяткі рабочых. Нават трава, якая расце на раздзяляльнай паласе, завозіцца з-за мяжы.

Што зможа ўбачыць госць сталіцы, калі праз некалькі гадоў зверне з МКАД на праспект Пераможцаў?



## 1. Аквапарк

Так і не знайшоўшы ніводнага інвестара, гарадскія ўлады пачалі будаваць першы сталічны аквапарк самастойна, рукамі «Мінскбуда» і крэдытнымі грашыма «БПС-Ашчадбанка». Агульны кошт праекта складае каля $80 мільёнаў.

Аквапарк будуецца стаханаўскімі тэмпамі. Працы не спыняюцца і ў выхадныя, а часам на дапамогу прыязджае і Аляксандр Лукашэнка. Прынамсі, на красавіцкім суботніку ён клаў цэглу ў адну са сценаў аквапарку. Будаўнікам застаўся роўна год да здачы аб'екта, а першых наведвальнікаў тут чакаюць 3 ліпеня 2013 года.



## 2. Мікраараён Ржавец (Лебядзіны)

Тэрыторыя гэтага мікраараёна «прадавалася» двойчы. Спачатку права на будаўніцтва атрымала расійская мільянерка Алена Батурына. Калі яе мужа Юрыя Лужкова адхілілі ад пасады мэра Масквы, Мінгарвыканкам знайшоў новага партнёра, на гэты раз — кітайскую «Бі-Ю-Сі-Сі». «Элітнае жыллё» пераўтварылася ў праект жылых высотак з кварталам катэджаў. Праўда, праз адсутнасць камунікацый ніводзін дом у Ржаўцы дагэтуль не можа быць здадзены.



## 3. «Альтэрсалюшнс»

Адно з падраздзяленняў «Трайпла» амаль дабудавала гіганцкі забаўляльны комплекс насупраць «Мінск-Арэны», закрыўшы ім ад праспекта элітныя дамы па вуліцы Піянерскай. Даўжыня будынка складае больш за 400 метраў, што робіць яго адным з самых доўгіх у сталіцы. Комплекс Юрыя Чыжа, які пакуль яшчэ не атрымаў гучную назву, уключыць у сябе гіпермаркет, казіно, кінатэатр, аўтасалон, фітнэс-цэнтр і рэстараны.



## 4. НАК + Radisson

Летась расійскі інвестар спыніў фінансаванне будоўлі, і яна замарозілася амаль на год. Аднак ініцыятыву падхапіў Мінгарвыканкам, які цяпер дабудоўвае сваімі сіламі штаб-кватэру Нацыянальнага алімпійскага камітэта і 4-зоркавы гатэль Radisson з відам з нумароў на могілкі. У лепшым выпадку аб'екты будуць здадзены ў 2014 годзе, аднак ужо цяпер відаць, што ён можа стаць адным з самых прыгожых будынкаў беларускай сталіцы.



## 5. Новая рэзідэнцыя кіраўніка дзяржавы

На перакапанай паркавай зоне каля Свіслачы працягваецца ўзвядзенне таямнічага комплексу з рэзідэнцыяй і будынкам для ганаровых прыёмаў. За глухой агароджай з сістэмай відэаназірання штодня круцяцца чатыры краны і працуюць дзясяткі рабочых. Пакуль ім удалося вывесці будынак на ўзровень трэцяга паверха.



## 6. «Замак»

Аналаг забаўляльнага комплексу ад «Альтэрсалюшнс» паўстане насупраць новай рэзідэнцыі Лукашэнкі. Вось толькі замест Юрыя Чыжа ўласнікам будзе Павел Тапузідзіс, а замест «Трайпла» адкрыецца гіпермаркет «Карона». Крама тэхнікі, рэстараны, казіно, стрыптыз-клуб — тыповы набор для буйнога гандлёвага цэнтра ў Мінску сёння.

З навінак варта ўзгадаць першую ў Мінску лядовую пляцоўку пасярод крамы. Чым яшчэ «Замак» будзе вылучацца, дык гэта інтэр'ерамі — комплекс выкананы ў выглядзе сярэднявечнай гандлёвай вуліцы.

Першы пускавы комплекс (100 тысяч кв.м) коштам $120 мільёнаў плануецца адкрыць ужо сёлета на 3 Ліпеня. Гэта будзе найбуйнейшы шопінг-мол Беларусі.





## 7. «Вікторыя»

Будоўля другога пускавога комплексу муніцыпальнага гатэля «Вікторыя» ідзе жвавенька. Пабудавана ўжо 10 паверхаў, палова ад запланаванага. Уласнікам будзе камунальнае прадпрыемства «Бізнэс-цэнтр «Сталіца», а працы вядуць польскія рабочыя. Агульны кошт праекта складае каля 50 мільёнаў еўра.

## 8. Музей ВАВ

Для ўлады гэты аб'ект другі па прыярытэтнасці пасля аквапарку. Падчас суботніка тут залівала бетон другая асоба краіны — прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч. Мяркуецца, што музей пераедзе з Кастрычніцкай плошчы на новую пляцоўку ў 2014 годзе. Грошы на яго будаўніцтва ідуць з бюджэту, а таксама з рахунка добраахвотна-прымусовых ахвяраванняў беларусаў. Агулам жа трэба ўзяць аднекуль больш за $50 мільёнаў. Лагічны варыянт, каб будаўніцтва аплаціў інвестар, які будзе будаваць нешта на месцы старога музея, гарадскімі чыноўнікамі ўпарта не разглядаецца.



## 9. «Роял Плаза»

Ліванская кампанія «Рубіроз Інтэрнэшнл» скончае будаўніцтва стаметровай офіснай вежы — каркас будынка гатовы, засталося шкленне. Ліванцы валодаюць ужо гандлёвымі цэнтрамі «Еўропа» і «Рыга», а таксама кафэ «Біблас».

### Што яшчэ?

**11. Прыватная школа.** У элітнай навучальнай установе «Трайпла» змогуць вучыцца 400 дзяцей.

**12. Аздараўляльны комплекс** з офіснымі памяшканнямі будзе належыць «Заводу вінаградных вінаў «Дыёніс».

**13. Жылы комплекс «Славянскі».** Тры жылыя дамы і гатэль будуе расійская кампанія «Белінтэррасінвест.»

**14. Гатэль на Нарачанскай.** 35-павярховы будынак будзе каштаваць расійскаму мільянеру Мікалаю Бурносу $120 мільёнаў.

**15. Бізнэс-цэнтр «Пакроўскі».** Забудоўшчык «Трэст Прамбуд».

**16. Рэканструкцыя** выставачнага цэнтра «Белэкспа».

**17. «Славянскі квартал».** Тры жылыя дамы будуе кампанія "Знешэканамбуд" на чале з былым старшынёй Мінгарвыканкама Уладзімірам Ярмошыным.

Выглядае на тое, што менавіта «Роял Плаза» стане першым сапраўдным хмарачосам у Беларусі. Яе канкурэнты фактычна замарозілі свае будаўніцтва.



## 10. Galleria Concept

20-павярховы гандлёвы цэнтр з гатэлем мусіць узнікнуць на месцы знесенага інтэрната БДУ. Нарвежскі інвестар гатовы ўкласці ў будаўніцтва $150 мільёнаў. Жыхары суседніх дамоў выступалі супраць будаўніцтва, але Мінгарвыканкам адстаяў праект.

**Ягор Марціновіч**

# «Прадаць радзіму кожны зможа, а захаваць — не ўсім дадзена»

**Што такое моладзевы атрад БРСМ, чаму яны ходзяць «тройкамі» з міліцыяй, мары служыць у спецназе, развагі пра патрыятызм і апазіцыю.**

У №16'2012 «НН» размяшчала здымак актывістаў моладзевых атрадаў БРСМ. Фота «вузкаплечых памочнікаў спецназа» выклікала неадназначныя каментары.

### Ад байца да камандзіра

Максіму Пінчуку 21 год. Ён навучэнец апошняга курса індустрыяльна-педагагічнага каледжа. У БРСМ уступіў ячшэ ў школе. Але ў той час ён асабліва не актыўнічаў, былі іншыя жыццёвыя інтарэсы. БРСМ не вытрымліваў канкурэнцыю сяброў-гулянак.

Пераезд у Мінск на вучобу змяніў стаўленне хлопца да грамадскай дзейнасці. Пабачыўшы інфармацыю пра Моладзевы атрад аховы правапарадку на стэндзе каледжа, ён адразу падаў заяўку на ўступленне.

За паўгода Макс зрабіў кар'еру: ад байца да камандзіра. Зрэшты, званняў у МААПе ўсяго тры: баец, намкамандзіра і камандзір.

### Ходзяць «тройкамі»

«Ажыццяўленне дапамогі праваахоўным органам Фрунзенскага раёна», —адрапартаваў хлопец пра свае абавязкі. Гаворыць канцылярызмамі.



**Максім Пінчукоў марыць працаваць у БРСМ і не разумее, адкуль апазіцыянеры бяруць грошы.**

Дапамога заключаецца ў сумесным з міліцыяй патруляванні раёна. За адным міліцыянерам замацоўваюцца два байцы БРСМ, і гэтыя «тройкі» ходзяць разам па раёне, сочаць за парадкам. Адзін — у форме, два — у цывільным. Максім на дзяжурства заўсёды апранае строй і патрабуе гэтага ад іншых байцоў.

### Пашанцавала патруляваць са спецназам

Найбольш распаўсюджаныя правапарушэнні, з якімі сутыкаюцца на дзяжурствах, — распіццё спіртных напояў у грамадскіх месцах. Парушальнікаў забіраюць, а байцоў запісваюць у пратакол як сведкаў.

Мінулым летам, расказвае Максім, пашанцавала патруляваць разам са спецназаўцамі. Тады нават давялося ўжыць фізічную сілу да аднаго злоснага правапарушальніка, аматара папіць гарэлачкі на прыродзе.



**Вучэнні атрада ў спецназаўскай амуніцыі.**

### Ёсць і дзяўчаты

Максім вось ужо 2 гады з'яўляецца камандзірам. У яго атрадзе 37 хлапцоў і 5 дзяўчат. Апошнія выконваюць працу не горш за сваіх таварышаў. Максім прыводзіць прыклад дзяўчыны, зараз выпускніцы, якая працавала звыш плана.

Ініцыятыва не засталася незаўважанай: дзяўчыне прапанавалі працу сакратаркай у судзе. У далейшым яна плануе ісці ў Акадэмію МУС. Для маапаўцаў там прадугледжаны льготы. Перавагі для байцоў ёсць і пры паступленні ў Вайсковую акадэмію ды на вайсковыя кафедры некаторых ВНУ.

### «Баявыя» ўзнагароды

Яшчэ адзін важны бонус для ўступлення ў МААП — дадатковыя балы пры засяленні ў інтэрнат. Аднак гэты прывілей тычыцца найбольш актыўных байцоў.

Максім з гонарам дэманструе свае «баявыя» ўзнагароды. Найвышэйшую — «За выдатную ахову правапарадку» — ён атрымаў летась. Апроч патрулявання з міліцыяй, байцы прысутнічаюць на мерапрыемствах каледжа: канцэртах, дыскатэках. На выпускных вечарах даводзіцца дзяжурыць усю ноч. «Не кожны можа такое вытрымаць. Спаць усё-ткі хочацца», — кажа Максім.

**«Там класна, ёсць бонусы і праца не цяжкая»**

«НН» вырашыла папытацца ва ўдзельнікаў, чаму яны прыйшлі ў моладзевыя атрады.

Вячаслаў студэнт БДУ, з Браслава, прыйсці ў атрад параіў сябар. Маўляў, «там класна, ёсць усякія бонусы і праца не цяжкая». Сябрам атрада даюць бясплатныя білеты ў басейн і трэнажорку.

18-гадовы Юра з Мінска ўступіў, каб дапамагчы нашай дзяржаве ў ахове правапарадку. «Праваахоўныя органы не ў сілах прасачыць за ўсімі і адразу», — так аргументаваў ён свой адказ.

Яўген Раўдановіч, чацвёртакурснік БДУ з Астраўца, у МААПе ад пачатку вучобы. Хлопец марыў стаць вайскоўцам, але не прайшоў медкамісію. Таму ў «грамадзянскай» ВНУ адразу зацікавіўся дзейнасцю атрадаў. Зараз ён камандзір адразу дзвюх структур: МААП і дружыны БДУ.

**АР**

### Патрыятызм ды каханне

Пару разоў на год байцы праходзяць вучэнні. Мінулым летам ездзілі ў вайсковую часць спецназа, апраналі ўсю экіпіроўку: налакотнікі, шчыт, каску, бронежылет. «Шчыты звычайныя металічныя, бачна, што яшчэ часоў Савецкага Саюза», — расказвае Максім.

Пасля паездкі тры навучэнцы каледжа захацелі служыць у спецназе. «Гэта лепш, чым яны будуць «касіць», у парках піва піць. Усё-ткі там патрыятызм развіваецца», — кажа хлопец.

«Радзіма і патрыятызм — гэта нешта большае, што нельга апісаць на словах. Гэта як і каханне. Не кожны паэт можа сказаць, што гэта такое».

### Як апазіцыя перацягвае

У дзейнасці МААПа Максіму больш за ўсё падабаецца фізічная падрыхтоўка, уменне весці рукапашны бой ды правільна паводзіць сябе ў надзвычайных сітуацыях, у тым ліку на мітынгах. Кажа, на адным з мітынгаў, дзе ён дзяжурыў, бабулькі-ўдзельніцы спрабавалі перацягнуць «на свой бок», заклікалі далучыцца. Але ён іх, канечне ж, ігнараваў.

Закрануўшы тэму мітынгаў, гутарка зайшла пра палітыку. Максім падтрымлівае курс дзеючага кіраўніка. «За яго галасуе народ», — кажа хлопец. Сумленнасць падліку галасоў не выклікае ў яго сумневаў. А тыя некалькі тысяч чалавек, якія «супраць», верагодна, кімсьці падкупленыя. «Прадаць радзіму кожны зможа, а вось захаваць —не кожнаму дадзена», — кажа малады маапавец.

### Працуе за 150 тысяч

Ён дзівіцца, адкуль грошы ў яго знаёмай-апазіцыянеркі, якая нідзе не працуе, але сама аплочвае вучобу і на ўсё мае грошы. Сам ён за актывізм атрымлівае 150 тысяч, ды яшчэ 500 тысяч стыпендыі (з надбаўкамі за дзяжурствы). Да таго ж, мае «шабашкі», падпрацоўкі на будоўлі. На жыццё гэтага хапае, можна быць незалежным ад бацькоў.

Гэтым летам хлопец скончае каледж. Наперадзе — размеркаванне і праца. Але Максім марыць працаваць не па спецыяльнасці, якую атрымліваў у каледжы, а ў ЦК БРСМ. Былі б толькі вакансіі.

**Аксана Рудовіч**

# «Застабілы, як твой муж, павінны здохнуць»

**Сям'і гамельчука, чыё імя трапіла ў «інтэрнэт-тролінгавы» скандал, пагражаюць невядомыя.**

Жыццё інтэрнэт-троляў на першы погляд выглядае бясклапотным — сядзіш за камп'ютарам, правакуеш сваімі каментарамі іншых карыстальнікаў, а пасля яшчэ і атрымліваеш за гэта грошы. Аднак ёсць і другі бок медаля.

На тых, чыю асобу западозрылі ў тролінгу, сыплюцца абразы і пагрозы ад неабыякавых. З такой сітуацыяй сутыкнулася сям'я 24-гадовага гамельчука Андрэя Куцэнкі. Мужчыну лаюць у сацыяльных сетках, падазраючы ў платным тролінгу за Лукашэнку.

### Неабходныя тролі

«Неабходны постынг у каментарах на некалькіх сайтах. Усе сайты палітычныя і апазіцыйныя. Сутнасць пастоў — адэкватныя каментары, цалкам адпаведныя поглядам патрыятычна настроенага чалавека, які прытрымліваецца кіруючага рэжыму (па сутнасці — трэба аспрэчыць артыкул)» — некалькі аб'яваў з такім зместам, з'явіліся на сайце free-lance.ru. Цікава, колькі плацяць беларускім сецiўным «тролям» і якія патрабаванні выстаўляюцца да іх працы?

«НН» паспрабавала знайсці аўтара аб'яваў. Яны належаць чалавеку пад нікам Расавака. Таксама ад яго імя размяшчаліся прапановы аб раскрутцы гомельскага сервера камп'ютарнай гульні World of Warcraft і шукаліся аўтары іранічных чатырохрадкоўяў.

Указаныя на сайце імёны ў скайпе і «асьцы» прывялі да Андрэя Куцэнкі. Калі карэспандэнт «НН» звярнуўся да яго і прадэманстраваў гатоўнасць за грошы «патрыліць» на форумах, той адразу ж адказаў, што да аб'яваў дачынення не мае.

### Не працадаўца, а выканаўца

На наступны дзень мы пагрукаліся ў скайп да Андрэя, цяпер ужо прадставіўшыся «Нашай Нівай». Ён падрабязна расказаў сваю гісторыю.

Па словах Андрэя, ён сапраўды меў акаўнт на сайце free-lance.ru, аднак іншы, не як працадаўца, а як выканаўца. Што да «фальшывага» акаўнта, то частка заданняў насамрэч звязана з ранейшай дзейнасцю Андрэя.

«Раней я часцяком шукаў дапамогі на форумах, напрыклад, па стварэнні нейкіх скрыптоў і напрацовак. І многія заданні на free-lance.ru капіююць мае пасты на іншых форумах».

### «Падзяляю некаторыя пазіцыі Лукашэнкі»

«Калі я прасіў дапамогі ў рэалізацыі чагосьці — чалавек посціў аб'яву на Фрылансе і падшукваў для мяне рэальных памочнікаў. Цяпер жа з незразумелых прычынаў гэты ж чалавек посціць палітычныя аб'явы, — мяркуе Андрэй. — Я падзяляю некаторыя пазіцыі Лукашэнкі, аднак не настолькі, каб пісаць пасты ў яго падтрымку».

Так ці інакш, з пагрозамі сутыкнуліся і Андрэй, і ягоная жонка. «Усе мае дадзеныя ёсць у сеціве, я ні ад каго іх не хаваю. Былі адкрытыя нават мае адрасы. Аднак цяпер людзі дадаюцца да мяне і да жонкі ў сябры ў сацыяльных сетках і пішуць розную лухту. Напрыклад, жонцы прыйшло: «Застабілы, як твой муж, павінны здохнуць».

Я сапраўды не ведаю, як паўплываць на сітуацыю, як абараніць сваю сям'ю», — прызнаецца ён.

**Ягор Марціновіч**

# Былы суддзя: Залежнасць суддзяў ад уладаў даведзена да абсурду

Усімі пытаннямі судовай сістэмы кіруе Адміністрацыя прэзідэнта.

Аляксандр Дзядок адпрацаваў у судовай сістэме 18 гадоў. Так супала: калі ён выйшаў у адстаўку, на лаве падсудных апынуўся яго сын Мікалай — яго арыштавалі па так званай справе анархістаў. Аляксандр расказаў «Нашай Ніве» пра некаторыя асаблівасці беларускага суда і справу свайго сына.

**«Наша Ніва»: У канцы 2009 Вы сышлі ў адстаўку па выслузе гадоў з пасады суддзі крымінальнай калегіі Мінскага абласнога суда. Чаму не хацелі працаваць далей?**

**Аляксандр Дзядок:** Мне падабалася мая праца. Але суддзі абсалютна перасталі быць самастойнымі і выконваюць толькі загады. Даходзіла да абсурду: суддзя з кіраўніком узгадняў не толькі артыкул Крымінальнага кодэкса, па якім чалавека судзіць, але і пакаранне.

Суддзі баяцца прымаць самастойныя рашэнні. За апошнія гады іх адвучылі гэта рабіць. Усімі пытаннямі кіруюць старшыні судоў, кіраўнікі судовай сістэмы, а імі — Адміністрацыя прэзідэнта. Чым больш я гэта разумеў, тым больш мне не хацелася быць марыянеткай у чыіхсьці руках.

**«НН»: Боязь самастойна прымаць рашэнні прыйшла разам з палітычнымі працэсамі?**

**АД:** Гэта тычыцца амаль усіх спраў — не толькі палітычных.

**«НН»: На Вашай практыцы суддзяў здымалі за «няправільна» прынятыя рашэнні?**

**АД:** Не магу прыгадаць. Калі суддзя нешта зрабіў не так, як хацела кіраўніцтва, то «разумныя» начальнікі ніколі не дзейнічалі груба і наўпрост. Маўляў, ты нас не паслухаўся і мы цябе здымаем. Усё робіцца нашмат танчэй. На суддзю пачынаюць ціснуць. Суддзя — гэта чалавек, таму чакаюць, пакуль ён зробіць памылку альбо плюне і сыдзе сам.

**«НН»: Блогер d-zholik напісаў, што за тры месяцы гэтага года паўнамоцтвы суддзяў з сябе склалі 16 чалавек, а летась — толькі 11. Гэта вялікія лічбы?**

**АД:** Нельга гаварыць, што суддзі бягуць толькі праз тое, што тут адбываецца. Пра гэта можна толькі меркаваць, пакуль не валодаем інфармацыяй па кожным выпадку. Але я ведаю людзей у судах, якія яшчэ маглі б працаваць, але іх «выціснулі», бо яны мелі хаця б крыху смеласці выказваць сваё меркаванне па прафесійных пытаннях.

**«НН»: Намеснік старшыні Следчага камітэта Андрэй Швед заявіў, што летась узрасла колькасць апраўдальных прысудаў — з 217 да 382. Пра што гэта сведчыць?**

**АД:** Мяркуючы па стане нашай судовай сістэмы, цяжка паверыць, што павялічылася колькасць апраўдальных прысудаў. Гэта хутчэй за ўсё ведамасныя гульні са статыстыкай спадара Шведа і іншых кіраўнікоў следчых падраздзяленняў. А іх у нас цяпер толькі два — падраздзяленне ў КДБ і Следчы камітэт. І гэтая гульня, магчыма, вядзецца для таго, каб прадэманстраваць сваю дзейнасць кіраўніцтву краіны. Але гэта не сведчыць пра ўзмацненне ролі правасуддзя ў Беларусі. Кожны такі апраўдальны прысуд так ці інакш узгадняецца на розных узроўнях, і не толькі судовых.

**«НН»: Як былы суддзя што думаеце пра справу Вашага сына?**

**АД:** Гэта адно звяно з ланцуга крымінальна-палітычных спраў. Гэтая справа сведчыць пра прэвентыўную зачыстку грамадска-палітычнага поля.

Ні прамых, ні ўскосных доказаў віны майго сына не было. Асноўнымі былі сведчанні двух маладых людзей. Аднаго з іх у судзе не дапыталі — хоць ён знаходзіўся ў Мінску, яго нібыта не знайшлі, каб выклікаць. Таму зачытваліся яго паказанні з папярэдняга следства. А другі сведка на працэсе заявіў пра ціск з боку супрацоўнікаў КДБ і МУС, пад якім ён агаварыў майго сына.



**Аляксандр Дзядок** узначальвае аддзел па юрыдычнай і кадравай рабоце аднаго з упраўленняў «Белтрансгаза». Працаваў следчым, пракурорам Брагінскага раёна, юрысконсультам, старшынёй раённага суда Гомеля, суддзёй крымінальнай калегіі Мінскага абласнога суда.

**«НН»: Тым не менш, Мікалаю далі не самы маленькі тэрмін…**

**АД:** Прысуд празмерна суровы. Сына абвінавацілі па ч.2 арт. 339 КК (злоснае хуліганства). У маёй практыцы не было выпадкаў, каб чалавека асудзілі па гэтым артыкуле на пазбаўленне волі, калі не пацярпелі людзі. Прычына, лічу, адна — сын не прызнаў сваю віну. А тыя, хто агаварыў яго, зусім не трапілі на лаву падсудных. Хаця і прызнавалі, што ўдзельнічалі ў тых эпізодах.

**«НН»: Неаднаразовае змяшчэнне Мікалая ў ШІЗА, перавод у іншую калонію — спробы выбіць з яго прызнанне віны?**

**АД:** Ціск на сына быў ад пачатку. А як толькі ён у калоніі ў Магілёве адмовіўся падпісаць прашэнне аб памілаванні, на яго паступова ціск пачаў узрастаць. Яго пяць разоў каралі за незашпілены каўнерык, рукі ў кішэнях, не правільна адрэагаваў на заўвагу, як мне па тэлефоне сказаў начальнік калоніі. Спачатку пазбаўлялі перадач, скарачалі спатканні альбо пазбаўлялі іх, затым змяшчалі ў ШІЗА.

**«НН»: Па-Вашаму, ёсць верагоднасць, што яго адпусцяць раней заканчэння тэрміну?**

**АД:** Вярхоўны суд ужо пазбавіў яго права быць вызваленым па законе «Аб амністыі» 2010. Сын нарадзіўся ў Чарнобыльскай зоне, калі я працаваў пракурорам Брагінскага раёна. Але суд палічыў, што гэта няпраўда. І прымусіў Гомельскі абласны суд адмяніць рашэнне Брагінскага раённага суда, якім было ўстаноўлена гэта юрыдычна. Затым райвыканкам ануляваў законна выдадзенае сыну чарнобыльскае пасведчанне, якое давала падставы вызваліць яго і зняць судзімасць.

Гутарыў Сяргей Макарэвіч

### Фотафакт




11 мая ў Парыжы прайшла акцыя салідарнасці з Алесем Бяляцкім. Выступае мэр 11-й акругі французскай сталіцы Патрык Блош.

## Штраф за зняважанага Леніна

Камуністы пакрыўдзіліся на маладафронтаўцаў.

Члены Камуністычнай партыі Беларусі Мікалай Юшчанка і Мікалай Валовіч патрабавалі спагнаць з маладафронтаўцаў Міхася Мускага, Рамана Васільева і Паўла Сяргея 4,5 млн рублёў за матэрыяльную і маральную шкоду. Партыйцы палічылі сябе зняважанымі акцыяй маладафронтаўцаў на 7 лістапада 2011. Тады маладыя людзі закідалі яйкамі помнік Леніну на плошчы Незалежнасці ў Мінску. У выніку ў Юшчанкі аказалася запэцканым паліто.

Суд Маскоўскага раёна Мінска задаволіў пазоў часткова. Ён пастанавіў спагнаць агулам 1 мільён 897 тысяч рублёў матэрыяльнай і маральнай кампенсацыі.

КМ

# Каваленка аднавіў галадоўку

Ён патрабуе вызвалення ўсіх палітвязняў.

Актывіст КХП-БНФ Сяргей Каваленка ў ноч з 7 на 8 мая быў этапаваны з Мінска ў Віцебск, дзе яго змясцілі ў адзіночную камеру СІЗА №2. Тамака ён аднавіў галадоўку. Палітвязень папярэдне пратэстуе супраць свайго зняволення, якое лічыць незаконным. Па словах яго жонкі Алены, Сяргей патрабуе вызваліць усіх палітвязняў у краіне і даць свабоду нацыянальнай сімволіцы.

Сяргея Каваленку асудзілі на два гады і адзін месяц за ўхіленне ад адбыцця пакарання. Да гэтага прысуду ён быў пакараны трыма гадамі «хатняй хіміі» за вывешванне бел-чырвона-белага сцяга на навагоднюю яліне 7 студзеня 2010 у Віцебску. За кратамі Сяргей трымаў дзве галадоўкі. Першая доўжылася 30 дзён, другая, з якой ён выходзіў у псіхіятрычнай бальніцы, — паўтара месяца. У абодвух выпадках яго пачынalі выводзіць з галадоўкі прымусова, а затым палітвязень пачынаў есці сам.

СМ



Здымак зроблены падчас вваду Сяргея Каваленкі з галадоўкі ў псіхіятрычнай бальніцы ў мінскіх Навінках.

# Бел-чырвона-белыя сцягі побач з чырвона-зялёнымі

На беларускія матчы **злятаюцца суродзічы** з Фінляндыі, Эстоніі і Піцера.



Гульня беларускіх хакеістаў не радуе, але беларусы ўсё адно з'язджаюцца, каб падтрымаць сваіх. На матчы Беларусь — Францыя заўзятары віталі зборную як афіцыйнымі, так і нацыянальнымі сцягамі.

Сяргей, беларус з Піцера, і яго сябар Віктар прыехалі ў Хельсінкі на некалькі матчаў з удзелам нашай зборнай. Сяргей родам з Берасцейшчыны, апошнія 8 гадоў жыве ў Расіі, але радзіму не забывае.

На трыбуне непадалёк ад яго сядзеў старшыня Федэрацыі хакея Беларусі Яўген Ворсін. Сяргей сфатаграфаваўся разам з ім. Але Ворсін не хацеў, каб у кадр трапіў б-ч-б сцяг, «каб не падумалі, што ён «з нашых», смяецца піцерскі беларус.

Нашы заўзятары як з чырвона-зялёнымі, так і з бел-чырвона-белымі сцягамі крычалі па-беларуску «Беларусы — назаўжды!» і «Нам трэба гол!». Аднак на вынік гульні гэта, на жаль, не паўплывала.

**Аксана Рудовіч, Хельсінкі**



Яшчэ адна шайба ў нашай браме.

# Не выканалі «наказ партыі»

Беларускія хакеісты **цудам пазбеглі** развітання з элітай.

Шэсць «баранак» пры адной нягеглай перамозе над Казахстанам — улоў хакейнай зборнай Беларусі на чэмпіянаце ў Хельсінкі.

Колькі гучных праграм абвяшчаецца на дзяржаўным узроўні аб падтрымцы хакея ў краіне, спартсмены атрымліваюць па 15 тысяч даляраў у месяц, а другі чэмпіянат свету запар прайграём Францыі, дзе хакей на паўпрафесійным узроўні.

У выніку Беларусь заняла 14-е месца. Апошняе, што давала права застацца ў дывізіёне А. Перад чэмпіянатам жа ставілі мэтай трапіць у васьмёрку наймацнейшых. Прычым на мінулым першынстве сітуацыя была аналагічнай.

Наш капітан Уладзімір Дзянісаў кажа, што «па вяртанні ў Мінск будзем хадзіць, як страусы, засоўваць галаву ў пясок». А вось кіраўнік Федэрацыі хакея Яўген Ворсін лічыць, што «хлопцы праявілі сябе».

**Зміцер Панкавец**

# Сотні карыстальнікаў аб'явілі байкот «Укантакце»

**У адказ на словы** стваральніка сацсеткі.

Стваральнік і ўладальнік сацыяльнай сеткі «Укантакце» Павел Дураў выклікаў хвалю абурэння ў расійскім інтэрнэце, калі пракаментаваў у сваім Твітары наступным чынам Дзень Перамогі: «Народ гуляе. Яшчэ 6 — 67 гадоў таму Сталін адстаяў у Гітлера права рэпрэсаваць насельніцтва СССР».

Дзясяткі іншых карыстальнікаў упадабалі яго фразу, аднак сотні — абурыліся і вырашылі байкатаваць сетку «Укантакце».

Яны размяшчаюць статусы з абразамі ў дачыненні Дурава. З вядомых асобаў «акцыю» падтрымаў пісьменнік і тэлевядучы Сяргей Мінаеў.

Да байкоту далучыўся і баксёр-дэпутат Мікалай Валуеў. Ён заявіў, што зачыняе сваю старонку «Укантакце».

**Ягор Марціновіч**






**Камертон Сяргея Ваганава**

# Папяровы жаўнер

10 мая Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з актывам Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. «Як ні горка казаць, — падкрэсліў кіраўнік краіны, — але шэрагі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны радзеюць. Гэта працэс натуральны...»

Не ведаю, ці была запланавана гэта сустрэча, але ёсць нешта прыкрае ў тым, што яна адбылася адразу пасля чарговага «шэсця ветэранаў» 9 мая. Мабыць, упэўніўся ў тым, што «натуральны працэс» так шпарка ідзе без перапынку, што пад пагрозай апынуўся працэс «патрыятычнага выхавання моладзі». Вельмі ўжо хутка сцішылася гарката ад «натуральнага працэсу», калі спатрэбілася неадкладна нагадаць «афганцам», што яны «баявыя нашчадкі ветэранаў...», што ім трэба браць ад іх «эстафету патрыятычнага выхавання моладзі... сцяг з іх рук і несці яго...»

...У заходнебеларускай вёсцы, дзе рос Пятро, на пачатку 80-х гадоў жывых удзельнікаў вайны заставалася не больш чатырох. Кожнае 9 мая разам з аднавяскоўцамі яны збіраліся за сталамі на беразе рэчкі, сярод маладых дрэўцаў, пасаджаных у памяць аб загінулых, і, выпіўшы на сумны ўспамін чарку, горка плакалі аб іх...

У Афганістане Пятра прызначылі кіроўцам БМП, бо ў мірным жыцці ён быў трактарыстам. Хутка БМП раскурочыў рэактыўны снарад. Загінулі ўсе восем — хто адразу, кагосьці дабілі. Пятро прыкінуўся мёртвым, што было не цяжка, бо кроў ажно свістала з амаль адарванай нагі...

У першае пасля вяртання на радзіму 9 мая Пятро ледзь дайшоў да берага — ніяк не мог прызвычаіцца да пратэза. Але дайшоў — з жонкай, аднагадовым сынам, ордэнам Чырвонай Зоркі на пінжаку і выкапаным дрэўцам, каб пасадзіць яго побач з ветэранскімі. Потым выпіў і горка плакаў ужо разам з імі...

Вярнуўшыся з Афгана, Пятро ні ў якую не пагаджаўся працаваць падлікоўцам на калгасным складзе, куды, не ведаючы, што з ім рабіць, пасылаў яго старшыня. «Дайце трактар, — прасіў старшыню. — Я здолею...» «Які трактар?!» — злаваўся старшыня, не разумеючы, што хадзіць на пратэзе Пятру цяжэй, чым працаваць на трактары. Іншым словам — жыць...

## Хутка сцішылася гарката ад «натуральнага працэсу» »

Трактар яму зрабілі на трактарным заводзе, аб чым дамовіліся добрыя людзі. Паставілі нават шведскае сядзенне, якое паварочвалася, каб зручней было залазіць у кабіну ці вылазіць з яе. І намалявалі на шкле чырвоную зорку. І пачаў Пятро на ім працаваць.

Але гэта не ўсё.

Гісторыя з трактарам набыла шырокую вядомасць, пра яе сталі пісаць у газетах. І раптам высветлілася, што ўсё сваё маладое жыццё Пятро хацеў быць падобным на Марэсьева, а камсамольцы з трактарнага толькі і марылі аб тым, каб зрабіць трактар для героя...

Так з Пятра пачалі рабіць папяровага жаўнера, з газетнай, так бы мовіць, паперы. Уцягнулі ў працэс «патрыятычнага выхавання», які, вядома, без «франтавых ста грамаў» не абыходзіўся.

Але яшчэ горш тое, што ён не абыходзіўся без хлусні.

Ну, як было тлумачыць моладзі, за што ваяваў у далёкім Афгане? За што загінулі тыя восем і яшчэ тысячы? За што згублена нага? За ордэн? Ці за той трактар са шведскім сядзеннем і намаляванай чырвонай зоркай на шкле?..

З цягам часу абодва складнікі працэсу зліліся ў адзіную плынь, якая аднойчы вынесла трактар наўпрост на прыдарожны слуп.

Трактар на тым жа заводзе адрамантавалі.

Але брыдотная плынь ужо несла Пятра бесперапынна. І данесла да лаўкі ў закутку райцэнтраўскага сквера, на якой ён і памёр.

Не паспеў, можна сказаць, «прыняць эстафету» і «ўзяць у свае рукі сцяг».

У Афгане ён здолеў сам перавязаць параненую нагу, суцішыць кроў і выклікаць па рацыі дапамогу.

На радзіме не знайшоў нічога, акрамя гарэлкі, каб перавязаць параненую душу і суцішыць боль... Ды і па якой рацыі і па якую дапамогу ён мог дакрычацца з лаўкі ў райцэнтраўскім скверы?

...Даўно ўжо сышлі з жыцця ветэраны з той паміраючай вёскі. Але штогод 9 мая збіраюцца на беразе рэчкі з розных іншых мясцін нашчадкі. Сярод іх, магчыма, і дзеці Пятра — усё, што ён насамрэч пакінуў у жыцці. Ды яшчэ шуміць на майскіх ветрах трапяткое лісце бярозкі, калісьці пасаджанай ім у гонар аднавяскоўцаў, забітых на вайне...

Якая ж яшчэ спатрэбіцца вайна, каб не перарывалася «патрыятычная» эстафета?!

*kamerton_41@mail.ru*



**In memoriam**

# Уладзіслаў Пятрайціс

9 мая спынілася сэрца каталіцкага святара Уладзіслава Пятрайціса, які апошнія гады працаваў у мястэчку Іказнь на Браслаўшчыне (Віцебская вобласць). Было святару 57 гадоў.

Нарадзіўся ў Літве, але глыбока шанаваў беларускую мову і культуру.

Ксёндз Уладзіслаў быў адным з першых, хто пасля распаду Савецкага Саюза пачаў маліцца і прапаведаваць па-беларуску. Выдаваў газету «Голас душы» — адно з першых беларускамоўных каталіцкіх выданняў.

Многія памятаюць пропаведзь ксяндза Уладзіслава пасля рэферэндуму ў 1995. Святар сказаў, што Пагоня з крыжам Хрыста цяпер зменена на герб з зоркаю Сатаны. Навошта вы галасавалі за сцяг, пад якім зачынялі касцёлы і вывозілі ксяндзоў на Сібір? — пытаўся кс. Уладзіслаў з амбона.

Ксёндз Уладзіслаў паставіў у Мёрах помнік ненароджанаму дзіцяці. Тады помнік быў першым у Еўропе. У Слабодцы ён пакінуў пасля сябе помнік Еўфрасінні Полацкай.

**Westki.info**

# Фальшывыя ветэраны

**Некаторыя абвешаныя медалямі «ветэраны ВАВ» ніколі не былі на фронце.**

Расійскія блогеры аб’явілі фотапаляванне на фальшывых ветэранаў, якія бяруць актыўны ўдзел у штогадовых парадах на 9 Мая. Як высветлілася, на пажылых масквічоў апранаюць кіцелі з адвольнымі ўзнагародамі. Першай вылічылі бабулю, якая за год паспела «даслужыцца» ад палкоўніка да генерал-маёра. Больш за тое, яна нібыта стала Героем Сацыялістычнай працы, прытым што апошні раз узнагарода выдавалася ў 1991 годзе! Сапраўдных ветэранаў абурыла, што яна аддавала чэсць, стоячы на трыбуне без галаўнога ўбора.

На наступных двух здымках дзядуля, які за год таксама зрабіў выдатную «кар’еру» — ад старшыны да капітана 1 ранга.

Выдатную тройцу завяршае пажылы мужчына, які, мяркуючы па нашыўках, быў чэкістам. Яго выкрылі ў тым, што ён прысвоіў сабе знакі Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы, а таксама павесіў на грудзі 7 ордэнаў Леніна. Блогеры правяралі па базах: такога спалучэння ўзнагарод ніколі не было ні ў аднаго чалавека.

Набыць фальшывыя ўзнагароды нескладана. Карэспандэнт партала kraj.by перад 9 Мая паспрабаваў знайсці ў інтэрнэце прадаўцоў і даведацца іх кошт. Як высветлілася, арыгіналы медалёў ці іх дакладныя копіі, якія зможа адрозніць толькі спецыяльная экспертыза, можна купіць за 6—30 тысяч рублёў. Ордэны каштуюць даражэй, аднак павесіць сабе на грудзі можна і зорку Героя СССР ($55), і ордэн Славы ($45).



**Бабулю за год паднялі з палкоўніка ў генерал-маёры.**


**НКВДыст узнагародзіў сябе сямю (!) ордэнамі Леніна.**


**Дзеда-матроса ўзвысілі са старшыны ў капітаны 1 ранга.**


**Побач з Лукашэнкам крочылі сыны, а таксама былі кіраўнік КПБ Яфрэм Сакалоў і кіраўнік аб'яднання ветэранаў Анатоль Новікаў.**

**Хто такія ветэраны?**

Згодна з заканадаўствам, да ветэранаў ВАВ адносяцца ўдзельнікі вайны, будаўнікі вайсковых аб’ектаў, удзельнікі разміравання акупаваных тэрыторый, удзельнікі блакады Ленінграда, экіпажы судоў, затрыманыя ў пачатку вайны, а таксама асобы, узнагароджаныя медалямі і ордэнамі за працу ў тыле. Удзельнікі нацыянальнага падполля на тэрыторыі Беларусі ветэранамі не прызнаюцца.

Сапраўдным удзельнікам вайны цяпер ужо больш за 85 гадоў, і ў такім узросце мала каму з іх удаецца ісці шэсцем. У той жа час на парадах ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны часта можна сустрэць нашмат маладзейшых людзей. Гэта пераважна прадстаўнікі сілавых структур, якія на мерапрыемстве ствараюць масоўку.

Падобная з’ява назіраецца і ў Беларусі. Падчас шэсця на 9 Мая ў Мінску інтэрнаўты звярнулі ўвагу на тое, хто з ветэранаў аказаўся ў першых шэрагах. Апроч Аляксандра Лукашэнкі і яго трох сыноў, былі заўважаныя былы кіраўнік ЦК КПБ Яфрэм Сакалоў і генерал-лейтэнант, член Савета Рэспублікі Анатоль Новікаў.

«Каго я бачу! Генерал-лейтэнант Новікаў (крайні злева). Ты ж маеш такія адносіны да перамогі — бо нарадзіўся ў 1941 годзе, — як я да бітвы пад Оршай! — разрадзіўся абурэннем былы дэпутат ад БНФ Сяргей Навумчык. — У Новікава на мундзіры няма ніводнай баявой узнагароды. Медаль «За адвагу» майго дзеда, шараговага чырвонаармейца, важыць у сто разоў болей», — піша ён.

Такое ж дачыненне да Вялікай Айчыннай вайны мае і старшыня Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў Анатоль Адоньеў, які ў красавіку 2010 года пікетаваў рэдакцыю незалежнай «Народнай волі». Абурэнне ветэранаў тады выклікала публікацыя ўспамінаў мінчука Іллі Копыла пра перыяд сталінскіх рэпрэсій і партызанскі рух. Вось толькі Адоньеў, які ачоліў «пратэсты», сам нарадзіўся ў 1937 годзе ў Стаўрапальскім раёне, таму да вайсковых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі дачынення не меў. Статус ветэрана ён атрымаў, бо служыў у раёне Суэцкага канала ў 1970—1972.

Тым часам колькасць сапраўдных ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны працягвае імкліва скарачацца. Жыццё кароткае, радзіма — вечная.

**Ягор Марціновіч**



СЯРГЕЙ ГУДЗІЛІН

**Рэальныя ветэраны адзначаюць Дзень Перамогі, як могуць. Фота зроблена 9 Мая ў вёсцы Кірава Брагінскага раёна Гомельскай вобласці. 85-гадовая Галіна Міхайлаўна сустракае на Дзень Перамогі сяброў-ветэранаў у сваёй хаце. Ужо некалькі год яна не можа самастойна хадзіць. Ад вёскі да Чарнобыльскай зоны — некалькі кіламетраў, да парада ў Мінску — амаль 400.**



**Фотафакт**

**Міліцыя шукае графіціставў, якія дзёрзка размалявалі электрычку ў Мінску. На станцыі Інстытут культуры невядомыя ў прамежку з 23.00 7 мая да 2.00 8 мая ўпрыгожылі 2 вагоны электрацягніка. Чытаты сайта «Нашай Нівы» з ахоўнікамі парадку нязгодныя. Агульная ацэнка чытачоў: стала ж харашэй!**

# Звёў рахункі з жыццём у студэнцкім інтэрнаце

Студэнт-азербайджанец прычыну свайго ўчынку **запісаў на тэлефон**.

23-гадовы Фарыд навучаўся на гістарычным факультэце БДУ. Як паведаміў кіраўнік прэс-службы Упраўлення Следчага камітэта па Мінску Аляксандр Герасімаў, хлопец скончыў жыццё самагубствам уначы на 11 красавіка.

Па словах Герасімава, малады чалавек рыхтаваўся да самагубства. Ён замкнуў дзверы ў пакой, завесіў фіранкі. Усе рэчы і адзенне расклаў па стосах. На адным з іх была запіска, у якой Фарыд падрабязна распісаў, каму што перадаць пасля яго смерці. Астатнія ж рэчы ён наказаў аддаць у дзіцячы дом і бедным. Яшчэ ў адной запісцы было адзначана, што прычыну свайго ўчынку малады чалавек запісаў на тэлефон. Але пакуль мабільнік знаходзіцца на экспертызе і следчыя не ведаюць, што гэта за запіс і на якой мове.

Суседзі Фарыда па пакоі паведамілі следчым, што малады чалавек часта наведваў гульнявыя клубы і нярэдка прайграваў у іх грошы. І апошнім часам ён быў чымсьці засмучаны — хадзіў пануры.

Устаноўлена, што каля двух гадоў таму студэнт спрабаваў парэзаць сабе вены. Прычына — непаразуменне з дзяўчынай.

Праз нейкі час пасля таго, як стала вядома пра самагубства, да інтэрната з'ехаліся прадстаўнікі азербайджанскай дыяспары. Гэта не адзіны прыклад такой салідарнасці прадстаўнікоў гэтага народа. Пасля таго, як нядаўна на мінскай кальцавой дарозе ў аварыі загінуў азербайджанец, на месца трагедыі з'ехаліся дзясяткі яго суайчыннікаў.

Паводле дадзеных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у Беларусі адзін з высокіх у свеце паказчыкаў па колькасці самагубстваў на 100 тысяч насельніцтва. У 2007 гэта лічба склала 57,5 выпадкаў. Побач з Беларуссю па гэтым паказчыку знаходзяцца толькі Расія, Казахстан, Шры-Ланка, Венгрыя.

**Сяргей Макарэвіч**

27-гадовы мінчук быў смяротна траўмаваны цягніком у Асіповіцкім раёне. Трагедыя здарылася 11 мая на перагоне Татарка — Мірадзіна. Малады чалавек разам з маці прыехаў у гэты дзень на лецішча ў вёску Ясень. Адпрацаваўшы на прысядзібным участку, хлопец пайшоў з дома да чыгуначнага прыпынку. Перад прыбыццём пасажырскага цягніка ён сеў на рэйкі. Машыніст заўважыў чалавека, націснуў тармазы і падаваў гукавыя сігналы, аднак поезд спыніцца не паспеў. Паводле слоў маці, за некалькі дзён да трагедыі сын выказваў намер учыніць самагубства. Пры аглядзе ў загінулага была знойдзена запіска з вершамі абстрактнага зместу суіцыдальнага характару.

**Тэлефоны службы экстранай псіхалагічнай дапамогі**

Служба экстранай псіхалагічнай дапамогі «Тэлефон даверу»: 8 (017) 202-04-01 працуе дзень і ноч.

Рэспубліканская тэлефонная «гарачая лінія» па аказанні псіхалагічнай дапамогі непаўналетнім, што трапілі ў крызісную сітуацыю: 8-801-100-16-11.



# Сілу ўжывалі — шыю не ламалі

Калі б не відэа ў інтэрнэце, то на **затрыманне ў Калінкавічах** не звярнулі б увагу.

У інтэрнэце з'явілася відэа затрымання міліцыянтамі маладога чалавека ў Калінкавічах на 1 мая. У двух кароткіх роліках нічога незразумела, акрамя таго, што два чалавекі ў форме скруцілі трэцяга, прыціснуўшы яго тварам да зямлі. У подпісе да відэа ж гаворыцца, што супрацоўнікі міліцыі маладому чалавеку нанеслі сур'ёзныя траўмы, у тым ліку нібыта зламалі шыю.

Па словах намесніка начальніка па ідэалагічнай працы і кадравым забеспячэнні Калінкавіцкага РАУСа Марыны Піліпец, 1 мая ў гарадскім парку адбылася бойка ў кампаніі маладых людзей. Супрацоўнікі міліцыі ўзяліся разняць іх. Была выкарыстана фізічная сіла. Піліпец адзначыла: калі чалавек, які фігуруе на відэа, звярнуўся ў бальніцу, падстаў для яго шпіталізацыі не было — маўляў, цяжкіх пашкоджанняў не атрымаў. Разам з тым, ён быў выпіўшы, па словах намесніцы начальніка РАУСа.

У Калінкавіцкай раённай бальніцы паведамілі, што 17-гадовы юнак правёў у іх хірургічным аддзяленні два дні, пасля чаго яго выпісалі на амбулаторнае лячэнне. І цяжкіх пашкоджанняў не зафіксавалі — ні пераломаў, ні чэрапна-мазгавой траўмы, а толькі сінякі.



**Канстанцін Рудзеня кажа, што слаба памятае той дзень.**

Пацярпелым аказаўся 17-гадовы Канстанцін Рудзеня. У размове з журналістам «НН» юнак адзначыў, што з таго дня не ўсё добра памятае. Ён гуляў з дзяўчынай, калі яму ў твар ударыў іншы малады чалавек. Канстанцін паваліўся. Пасля яго пачалі круціць міліцыянты. Адзначае, што памятае, як прасіў яго падняць, бо не мог дыхаць — яго моцна прыціскалі тварам да зямлі. Але не супраціўляўся. У сябе прыйшоў, калі быў ужо ў бальніцы. Юнак сказаў, што быў шпіталізаваны на тры дні. Адразу ж яму паведаміў доктар, што хлопец атрымаў страсенне мазгоў. Але ў выніку выпісалі, не зафіксаваўшы страсення ў дакументах. Па словах Канстанціна, праз некалькі дзён ён ізноў звярнуўся ў бальніцу і на два дні быў шпіталізаваны. Яму і да сёння баліць галава.

Па словах выканаўцы абавязкі начальніка калінкавіцкай міліцыі Аляксандра Сівака, вырашаецца пытанне з завядзеннем адміністрацыйнай справы на непаўналетняга за супраціў міліцыянтам і хуліганства. Разам з тым, юнаку толькі праз дзесяць дзён, калі справай зацікавіліся журналісты, выдалі накіраванне на экспертызу, каб зафіксаваць пабоі. Што павінны былі зрабіць у першы ж дзень.

Калінкавіцкім раённым аддзелам Следчага камітэта праводзіцца праверка па факце ўжывання міліцыянтамі фізічнай сілы.

**СМ**

## Сціcла

### Школьніка застрэлілі ў ціры

Праводзіцца праверка па факце гібелі 16-гадовага падлетка ў ціры ДТСААФ. Падлетак быў смяротна траўмаваны стрэлам у галаву 7 мая трэніроўцы. Пачаткова паведамлялася, што дзесяцікласнік адной са сталічных гімназій застрэліўся сам.

### Выраблялі нявкасную вантрабянку

У адной з вёсак Лідскага раёна быў выяўлены падпольны цэх па перапрацоўцы мясных субпрадуктаў. Аказалася, што нелегальную вытворчасць арганізавала адна з мясцовых жыхарак. Спецыялісты Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі прызналі, што канфіскаваная мясная прадукцыя шкодная для здароўя і непрыдатная да ўжывання ў ежу. Крымінальная справа заведзеная за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

### 2-гадовае дзіця загінула ад апёкаў

Трагедыя здарылася 11 мая ў Бабруйску. Мужчына паспрабаваў заправіць свой аўтамабіль з пластмасавай каністры, адбылося самазагаранне бензіну, у выніку чаго аўтаўладальнік, а таксама яго жонка і 2-гадовы сын атрымалі сур'ёзныя апёкі. Усе трое былі дастаўленыя ў бальніцу. Дзіця пацярпела больш за усіх, у яго былі апёкі 80% цела. Праз два дні хлопчык памёр у рэанімацыйным аддзяленні. Бацькі застаюцца ў бальніцы.

### Непаўналетні прадухіліў забойства

17-гадовы навучэнец каледжа ў электрацягніку Баранавічы — Мінск затрымаў 49-гадовага жыхара вёскі Малаеды Нясвіжскага раёна. У тамбуры вагона мужчына наносіў нажавыя раны свайму 32-гадоваму аднавяскоўцу. Ён паспеў нанесці не менш за дзесяць удараў у шыю, твар і па руках, а таксама ў грудную клетку. Юнак кінуўся да зламысніка і выбіў у яго нож, а затым выклікаў міліцыю. Хлопец самастойна затрымаў злачынцу, прымяніўшы прыёмы захопу і самаабароны.

**КМ**

# Signal гучыць



Рэдакцыя часопіса Signal заклікае мастакоў дасылаць матэрыялы на новы нумар — здымкі сваіх прац у добрай якасці, не публікаваныя нідзе раней. Кантактны мэйл: signalmagazine@mail.ru.

З'явіўся новы часопіс пра **стрыт-арт**.

Для адных стрыт-арт — гэта акт вандалізму, звязаны з псаваннем маёмасці і эстэтычнага вобразу горада. Для іншых гэта магчымасць адкрытага выказвання на любую тэму. Беларускае вулічнае мастацтва развілося настолькі, што займела сваё выданне — пілотны нумар часопіса Signal выйшаў нядаўна.

Ён зроблены ў выглядзе альбома, у якім галоўнае — выявы, а не тэксты. Імёнаў мінімум: большасць твораў падпісаныя псеўданімамі. Мастак Dream стварае на гарадскіх мастах і будынках стэнсілы з выявамі Міхалка, Ігната Дамейкі, Барбары Радзівіл. Графіці PEKUS'а з Брэста — выявы чалавечых галоваў — нечым нагадваюць мастацтва індзейцаў дакалумбавай Амерыкі. А YRA з Віцебска намаляваў на сцяне двухпавярховіка чорную лесвіцу з дворнікам, у рэалістычнасці якіх доўга сумняешся...

Адны з нямногіх названых — маладыя мастакі Алесь Благій і Аўгення Карпенка, якія насялілі добрымі ўсмешлівымі персанажамі белыя сцены дзіцячага кардыяхірургічнага цэнтра ў Мінску.

Стрыт-арт — самае народнае мастацтва, бо яго творы бачаць штодня тысячы людзей: вока чапляецца за выявы на сценах, на майках мінакоў, за мастацкія татуіроўкі на целах на пляжы. Жанры множацца — стэнсілы, постары, інсталяцыі... У вымушанай супрацы з дворнікамі паўстаў новы кірунак — фупрэматызм — каляровыя квадрацікі і прастакутнікі, з дапамогай якіх «таленты з ЖЭСа» знішчаюць начныя працы мастакоў.

Стрыт-арт — і самае старажытнае мастацтва. Бо чым, па-вашаму, былі наскальныя малюнкі старажытных людзей?

Новы часопіс двухмоўны: беларуска-англійскі. З часам ён можаператварыцца ў найпаўнейшы каталог твораў стрыт-арту. Фіксаваць іх мусова не толькі таму, што ў многіх геніяльна схоплены наш час і думкі сучаснікаў. Творы на сценах — вельмі недаўгавечныя.

**Ігар Няхведараў**






# Рыгор Барадулін: «Вы — неўміручыя»

Народны паэт Беларусі звярнуўся да чытачоў **з нагоды выхаду кнігі** «Тры мяхі дзядзькі Рыгора, альбо Сам-насам з Барадуліным».

Не ведаю, як і дзякаваць нястомнаму, працавітаму, таленавітаму Сяргею Шапрану, які з майго мармытання зрабіў цэлую кнігу.

На яе старонках я стараўся быць разумным і шчырым. Не ведаю, наколькі мне гэта ўдалося, — гэта ўжо хай чытачы мяркуюць.

Калі некаму нешта спадабаецца — гэта зноў дзякуй Сяргею Шапрану!

Маэстру Сяргею,
Пану Шапрану
Спяшаю сказаць
І падзяку й пашану.
Пакуль у нас будуць
Старацца Сяргеі,
Убачыць нас плён,
Не звядуцца надзеі.

Чытачам жа хачу пажадаць веры ў наш народ, у нашу будучыню і ў саміх сябе.

Без веры ў саміх сябе няма чалавека. Вера павінна быць нават на краі адчаю. Таму і маё пажаданне: хай вас трымае вера — вера ў тое, што вы ёсць, што вы будзеце, што вы — неўміручыя.

**Рыгор Барадулін**

Кніга Сяргея Шапрана **«Тры мяхі дзядзькі Рыгора, альбо Сам-насам з Барадуліным»** выйшла ў серыі «Кнігарня «Наша Ніва». Яна рыхтавалася 11 гадоў: першыя запісы аўтар зрабіў у 1999, апошнія — у 2010. Такога выдання ў бібліяграфіі дзядзькі Рыгора яшчэ не было: у форме няспешнай гутаркі, дыялогу, Барадулін апавядае ўсё сваё жыццё. Строгай храналогіі няма: аўтар пытаецца тое, што яго цікавіць, Барадулін адказвае, што ўспамінаецца.

Сябры Караткевіч і Быкаў, пасляваенная вёска, мама Акуліна Андрэеўна, мінскае літаратурнае жыццё, КДБ, палітыка, невядомыя вершы і трапныя пароды... Выйшаў своеасаблівы аўтабіяграфічны жыццяпіс Барадуліна. Патрэбы ў такой кнізе не было б, калі б Рыгор Іванавіч праз усё жыццё вёў дзённікі, лічыць аўтар.

«Фігуры такога маштабу, як Рыгор Барадулін, вартыя таго, каб любое іх слова было надрукаваным, — кажа Шапран. — А час ужо сам расставіць усё па сваіх месцах».

**СМ**




# Слуцкі пояс у кожны дом!

**А што з ім рабіць?**
Адказваюць Глобус, Пушкін, Ліпковіч...

«У доме кожнага беларуса павінен быць слуцкі пояс», — заявіў Лукашэнка падчас звароту да парламента і народа. «Наша Ніва» спыталася вядомых беларусаў, якое прымяненне слуцкаму поясу яны бачаць у сябе дома.

**Яўген Ліпковіч:** «Я даўно думаў, што «Мілавіца» мусіць пачаць выпускаць слуцкія паясы. Прычым адразу да панчохаў. Вось такое прымяненне слуцкага пояса мне вельмі падабаецца».

**Адам Глобус:** «Я люблю сучаснасць, а не бутафорыю. Таму ў мяне дома ніколі не будзе слуцкага пояса, толькі калі ў выглядзе фотаздымка ў падручніку па гісторыі мастацтва».

**Алесь Пушкін:** «Калі б у мяне быў слуцкі пояс, ён бы заняў самае пачэснае месца ў маім доме — побач з абразамі. Але ж гэта нейкая фантастыка! Я лічу, што гэтай фразай Лукашэнка дае каманду на вяртанне да нашых каштоўнасцяў. Я гэтай фразай буду карыстацца пры размовах з мясцовымі чыноўнікамі — калі, напрыклад, патрэбна рэстаўрацыя».

**Наста Палажанка:** «Я б сабе займела слуцкі пояс, але тут варта ўзгадаць, што апошні раз слуцкія паясы прывозілі з Літвы, таму трэба для пачатку, каб краіна мела свае паясы. Калі ж паясы будуць штучныя, то я не думаю, што гэта нейк абудзіць патрыятызм беларусаў. Тым не менш, супраць выступаць я не буду».

**Зміцер Вайцюшкевіч:** «Не вельмі ўлавіў гэтую думку, але дакладна магу сказаць, што слуцкі пояс — гэта прыкмета заможнасці, багатага жыцця. Няўжо 500 даляраў заробку — гэта багатае жыццё? Таму да слуцкага пояса ў кожным доме мы не дараслі, затое дараслі да саматканай кашулі — яе могуць дазволіць сабе ўсе беларусы».

**Апытваў Юрась Ускоў**

## Сціісла

**Генпракуратура забараніла Шнураву мацюкацца**

Афіцыйнае папярэджанне аб недапушчальнасці парушэння заканадаўства вынесена арганізатарам канцэрта расійскай групы «Ленінград», які павінен адбыцца 18 мая. Лідар «Ленінграда» Сяргей Шнураў выкарыстоўвае ў тэкстах сваіх песень нецэнзурную лаянку. Арганізатары абавязаліся правесці адпаведную гутарку са Шнуравым, «каб не дапусціць мата са сцэны».

**Litesound на «Еўрабачанні»**

24 мая адбудзецца другі паўфінал міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2012» у Баку (Азербайджан), у якім беларускі гурт Litesound з кампазіцыяй We are the heroes выступіць пад пятым нумарам. Па выніках выступу музыкі могуць прайсці ў фінал конкурсу, які адбудзецца 26 мая.

**Расійскі сцяг над Акадэміяй навук**

Наведнікі Нацыянальнай Акадэміі навук 15 мая былі шакаваныя: шыльды ля галоўнага ўваходу пазамянялі на «Московский городской суд», а над імі павесілі расійскія сцягі. Там здымалася расійскае кіно з Ігарам Вернікам. Якое — здымачная група не кажа. У сакратарыяце АН Беларусі паведамілі, што «падпісалі дамову пра неразгалошванне падрабязнасцяў здымак».

**Купалаўскі тэатр у Лондане**

10 мая купалаўцы прадставілі спектакль «Выкраданне Еўропы, альбо Тэатр Уршулі Радзівіл» на сцэне лонданскага тэатра «Блумсберы». Прыезд ініцыяваны Мінкультам Беларусі. Спонсарамі выступілі брытанскія кампаніі, што цесна супрацоўнічаюць з уладамі. Паралельна адбываецца Сусветны Шэкспіраўскі фестываль-2012, у рамках якога ў тэатры «Глобус» выступае забаронены ў Беларусі «Свабодны тэатр». Ён ставіць «Караля Ліра» па-беларуску.

**ЮУ; БелаПАН, «Тут і цяпер»**

# Выпадак у цягніку

Пачуў я гэта, і ў душы з'явілася надзея...

Днямі быў сведкам такой падзеі. Ехаў я ў цягніку Мінск—Кіеў. У суседняй плацкарце сядзелі сімпатычныя, крыху гламурныя дзяўчаты-модніцы, якія, як я зразумеў, ехалі ў Кіеў «патусіць» пару дзён. Яны ўвесь час гаманілі на самыя розныя тэмы (ад моды да анімэ), елі сушы, частаваліся белым вінОм, выходзілі паліць у тамбур доўгія цыгарэткі... І раптам адна з іх запытала: «А ва Украіне ж шмат людзей па-украінску размаўляе?» На што адна з сябровак адказала: «Ну так, у іх жа нават у школе ўсё на ўкраінскай мове». «Вось бы ў нас так...» — памарыла дзяўчына.

**Ілля, mail.by**

**Фотафакт**



**Дажынкі ў Маладзечне прайшлі, а дзіркі ў асфальце засталіся**

Чытач даслаў фотаздымкі адной з вуліц былой сталіцы свята ўраджаю.

«Была надзея на «Дажынкі». Але яны, гледзячы па вуліцы Тургенева, расчаравалі», — піша чытач. Па яго словах, ён паведаміў маладзечанскім уладам пра ўбачанае. Але тыя нібыта не захацелі з ім размаўляць, бо ён не захацеў прызнацца пра месца жыхарства.

# «Вывесці на шэсце 9 Мая чатырох вучняў»

Спусцілі загад.

Я класная кіраўніца адной з мінскіх школ. І мне, як і ўсім, спусцілі загад: вывесці на шэсце 9 Мая чатырох вучняў і самой з'явіцца. Апытала вучняў: ні адзін не хоча. У мяне 9-ы клас, у іх на Лукашэнку алергія ўжо.

У савецкі час нейк свядомасці такой не было: як гэта не прыйсці? Хадзілі тады. Цяпер жа — не хочуць, і ўсё.

Крычаць не люблю. Абзвоньваю бацькоў, упрошваю.

Такое свята з-пад палкі выхоўвае дзіцьцей... дзіць. А мы, настаўнікі, вечна змушаныя да гэтага фальшу, да гэтай абавязалаўкі. Гаворым дзецям высокія словы пра Лабановіча, пра Гервасія Выліваху, а самі ўмантаваныя ў сістэму, як жалезныя вінцікі. У маім узросце прафесію не памяняеш, дый люблю школу, дзяцей. Але ісці махаць чалавеку, якога глыбока не паважаю, якім нават пагарджаю — становішча, ад якога маё сэрца, сэрца настаўніцы роднай мовы, плача. Так ужо выхавалі мяне бацькі, неабыякавай.

**Валяціна П., Мінск**

# Улады Амстэрдама закрываюць публічныя дамы, а ў Беларусі хтосьці хоча іх адкрыць

Такую думку выказалі на канале СТБ.

Улады сталіцы Нідэрландаў прынялі рашэнне аб закрыцці двухсот публічных дамоў. Варта адзначыць, што цяпер там працуе 482 падобныя ўстановы. Прадстаўнікоў улады сур'ёзна трывожыць рост узроўню злачыннасці. Зачыніўшы шэраг публічных устаноў, яны разлічваюць зрабіць становішча на вуліцах спакайнейшым. Большая частка ўстаноў, якія будуць зачыненыя, размяшчаецца ў цэнтральнай частцы горада. Такая колькасць публічных дамоў, на думку прадстаўнікоў улады, не найлепшым чынам адбіваецца не толькі на рэпутацыі горада, але і на рэпутацыі краіны ў цэлым.

Акрамя публічных дамоў будзе зачынены шэраг кофі-шопаў, сэкс-шопаў і іншых крамаў, дзе дазволена набываць лёгкія наркотыкі. Завяршыць праект улады Амстэрдама разлічваюць да пачатку 2018. Згодна з новым праектам, цэнтр горада павінен стаць спакойным і ціхім месцам, а большая частка начных забаўляльных устаноў будзе размяшчацца на перыферыі.

На думку ж некаторых нашых спецыялістаў, легалізацыя прастытуцыі ў Беларусі неабходна і публічныя дамы трэба адкрыць у Мінску.

Такую думку ў праграмме «Такі лёс» на тэлеканале СТБ агучыла Таццяна Сіманенка, доктарка-гінеколаг: «Мая пазіцыя: легалізацыя прастытуцыі — гэта перш за ўсё забяспечыць абарону тым людзям. Яны прадаюць сябе, але не знайшлі яны, што іншага прадаць».

**Ігар К.**

# Беларуская глыбіня. **Калыска Ізраіля**

Піша Павел Севярынец.

*...І сказаў:*
*ад сёння імя тваё*
*будзе не Якаў, а Ізраіль,*
*бо ты змагаўся з Богам,*
*і людзей адольваць будзеш.*
*Быццё 32:28*



**Павел Севярынец**

палітык, пісьменнік. Сузаснавальнік Маладога Фронту, пасля Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі. Асуджаны на тры гады «хіміі» па справе так званых «масавых беспарадкаў» — так лукашэнкаўцы называюць пратэсты з патрабаваннем дэмакратыі і справядлівасці, што адбыліся ў дзень выбараў 19 снежня. Адбывае пакаранне ў Купліне Пружанскага раёна.

Берасцейшчына — наша Палесціна.

Тут, у аблічча беларускае глыбіні. Адразу ўлоўліваеш гэты трагічны надлом броваў, гэтую арліную гарбінку носа, гэтую стоеную ў зморшчынках ля куткоў вачэй вечную мудрасць, гэтую бездань чорнага позірку, якая то прыцягвае, то палохае, нейкую няўлоўную, ценем, хітрынку, рыжынку або характэрную ўсмешлівую гарчынку, а ў размове — так і не параможанае за дзве тысячы гадоў рассеяння «р»... І з самага нутра з нейкім шчаўчком — здагадка, быццам трэснуў суглобчык, калісьці, у дужанні з Госпадам пашкоджаны суглоб Якава, ад якога нашчадкі і атрымалі найменне ізраіля — «той, хто змагаецца з Богам»....

Беларускасць немагчыма зразумець без габрэйскасці. Паўтару яшчэ раз, бо чую, як цяпер, во, маўляў, ерась! — суглобы надтрэснулі ў многіх: глыбіню і драму тысячагадовай хрысціянскай Беларусі, яе свядомасць, дух і лёс марна расшыфроўваюць у адрыве ад паняццяў габрэйскага горада і мястэчка, россыпу геніяў і біблійных каранёў выбранага Богам народа.

## З Берасцейшчыны родам пяцёра прэзідэнтаў і прэм'ераў Ізраіля »

Беларусь, падпружаная нецярпімасцю з Захаду і рысай аселасці з Усходу, за некалькі стагоддзяў вынасіла пад сэрцам цэлы Ізраіль — лідара рэлігійнага сіянізму Меіра Бар-Ілана, заснавальніка Сусветнага сіяніцкага кангрэсу Навума Гольдмана, стваральніка габрэйскага руху Расіі Шмуэля Магілевера, старшыню сусветнай Сіяніцкай Арганізацыі Ар'е Дульчына, Егуду Бэн-Эліезэра, які аднавіў іўрыт, а таксама чатырох прэзідэнтаў і семярых прэм'ер-міністраў габрэйскай дзяржавы. Ды што казаць, калі яшчэ сто гадоў таму 2/3 жыхароў тых жа Пружанаў былі юдэямі.

Адноўлены Ізраіль, якому ў біблійных прароцтвах адводзіцца ключавая роля, быў зачаты, выращчаны, напоены тут, у сэрцы Еўропы — і з болем, з крывавымі каранямі перасаджаны на Святую Зямлю... Міжволі пачуеш і водгулле ўсёчалавечай таямніцы, і пакліканне Божае для краіны, і рэха Апакаліпсісу.

З Берасцейшчыны родам пяцёра прэзідэнтаў і прэм'ераў Ізраіля. Толькі ўдумацца: за 63 гады існавання дзяржавы!

Хіба не сімвалічна, што першым прэзідэнтам адноўленага Ізраіля стаў народжаны ў Моталі пад Янавам беларускі сіяніст Хаім Вейцман? Першакласны хімік (дапамагаў брытанцам у Другой сусветнай вайне распрацаваць высокаактанавае паліва і штучную гуму, атрымаў звыш 100 патэнтаў), выбітны дыпламат (ініцыяваў вядомую «Дэкларацыю Балфура», якая паклала пачатак адраджэнню Ізраіля ў брытанскай Палесціне), лідар сіяніцкага руху (прэзідэнт Сусветнай сіяніцкай арганізацыі ў 1929—1946), чыім імем названыя цэнтральныя вуліцы многіх ізраільскіх гарадоў...

Голда Меір, знакамітая пятая прэм'ерка Ізраіля ў 1969—1977, у эпоху нафтавага крызісу, аўтарка фразы «Майсей вадзіў нас па пустыні сорак гадоў і прывёў у адзінае месца на Блізкім Усходзе, дзе няма нафты», — родам з Піншчыны. Адна з дзвюх жанчынаў, хто падпісаў Дэкларацыю Незалежнасці Ізраіля, пасля расстрэлу ізраільскіх спартоўцаў на Мюнхенскай Алімпіядзе 1972 распарадзілася расшукаць і знішчыць усіх да адзінага тэрарыстаў з «Чорнага верасня».

Менахем Бегін з Берасця — сёмы прэм'ер Ізраіля — паходзіў з сям'і сакратара Брэст-Літоўскай габрэйскай грамады, страціў у Халакосце жонку і дзяцей, выбітны юрыст і паліглот (валодаў 9 мовамі), зрабіўся лідарам першага несацыялістычнага ўрада ў Ізраілі (1977) і разам з Анварам Садатам за мірнае пагадненне, падпісанае ў Кэмп-Дэвідзе, атрымаў Нобелеўскую прэмію міру... На ягоны загад у 1981 ізраільская авіяцыя разбамбіла іракскі атамны рэактар і не дала Садаму Хусэйну атрымаць ядзерную бомбу.

Іцхак Шамір (Езярніцкі), восьмы і дзясяты прэм'ер Ізраіля, з'явіўся на свет у Ружанах, як і Бегін, страціў усю сваю сям'ю ў вайну — і ў 1980-х стаў вядучым габрэйскім палітыкам: міністрам замежных спраў, абароны, старшынёй Кнэсета — і двойчы прэм'ерам.

Адсюль жа, з Берасця — бацька нядаўняга, пятнаццатага прэм'ера, Арыэля Шарона (маці, дарэчы, з Магілёва) — таго самага Шарона, стваральніка сучаснага ізраільскага спецназа, які падчас Шасцідзённай вайны ў чэрвені 1967 на чале бронетанкавай дывізіі прарваў фронт егіпцянаў і выйшаў да Суэцкага канала, ідэолаг руху пасяленцаў, адно з'яўленне якога на Храмавай гары ў Ерусаліме справакавала шматгадовую палесцінскую інтыфаду...

Людзі, народжаныя ў беднай, забітай правінцыі, уціснутыя, пагарджаныя — з усёй вераю, жарсцю і моцай старазапаветных герояў ахвяраваліся, біліся да крыві, ваявалі з усім светам, каб толькі застацца жыць на камяністым, пустынным шматку абяцанай зямлі, страчанай 19 стагоддзяў таму.

Шыкоўны экскурсійны тур па памятных мясцінах заснавальнікаў і кіраўнікоў габрэйскае дзяржавы па маршруце Берасце—Моталь—Пінск—Ружаны — паўдня з вецярком! — самае малое, што магла б зрабіць любая ўлада ў Калысцы Ізраіля.

Але ж галоўнае — не гэта. Важней зразумець.

У Беларусі толькі спыніся, прыслухайся — і востра адчуеш прысутнасць Божую. Ён, Творца сусвету, стаіць па-над калыскай калісьці выбранага ім народа, які Яго не прыняў, а цяпер нарадзіўся наноў — і ў той жа калысцы пакуль дрэмле ягоны брат — які калісьці прыняў, а цяпер забыўся.

Тут, у краі сумных і ўбогіх духам людзей, у валадарстве крыжоў, Курапатаў, Хатыняў і Трасцянцоў, перасякнутым слязьмі і потам, крывёю, атэізмам і сіянізмам, дастаткова толькі прачнуцца — і ў раптоўным, абуджаным адкрыцці зразумееш, з якой асаблівай пяшчотай над гэтай зямлёй чувае, любуецца і трывожыцца Усявышні.

*Куплін*

# Грандыёзная выстава Сапегаў у Вільні

Ёсць усё, апроч беларускага ўдзелу. Піша Алег Дзярновіч.

У Вільні ў палацы Хадкевічаў (Літоўская мастацкая галерэя) на вуліцы Вялікай, 4 (Didžiojo, 4) да 20 мая працуе маштабная выстава «Сапегі — дзяржаўныя дзеячы, мецэнаты і калекцыянеры».

Значнасць Сапегаў у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага цяжка пераацаніць: 51 з іх займаў найвышэйшыя пасады. Трое былі біскупамі, 30 — сенатарамі, 5 — гетманамі, 6 — канцлерамі і падканцлерамі...

Сапегі прайшлі шлях ад баяраў-русінаў да князёў Святой Рымскай імперыі; ад дробных землеўласнікаў да найбуйнейшых латыфундыстаў; ад абаронцаў праваслаўнай веры да ўсвядомленых пратэстантаў і гарачых каталікоў; ад баяраў на перыферыі Еўропы да грамадзянаў свету.

Сапегаўскай выставай Літва паказала, як такія рэчы трэба рабіць. Чаго варты 544-старонкавы каталог-фаліянт з пералікам экспанатаў і грунтоўнай даведкай пра кожны.

Экспанаты ж — рарытэтныя рэчы і мэбля з палацавых інтэр'ераў Сапегаў, кнігі іх бібліятэкі, дакументы, выданні Статута 1588, які склаў слынны канцлер Леў Сапега.

Дарэчы, летась Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў супрацоўніцтве з Расійскай нацыянальнай бібліятэкай (РНБ) выпусціла кампакт-дыск «Сапегіяна: кнігазбор роду Сапегаў» — з каталогам кніжак сапегаўскай бібліятэкі, адной з найбольшых у ВКЛ, і копіямі каштоўных выданняў. Пра кампакт-дыск на выставе звестак няма — адчуваецца, што беларускі бок не браў удзелу ў яе арганізацыі.

Але Беларусь непазбежна там прысутнічае. Найперш — у панарамных здымках храмаў, фундаваных Сапегамі, і іх рэзідэнцыяў: замкаў у Старым Быхаве, Гальшанах, Дзярэчыне, кляштараў картузаў у Бярозе і кармелітаў у Бялынічах, палаца ў Ружанах, езуіцкага калегіума ў Оршы, царквы Св. Тройцы ў Чарэі, касцёла Св. Андрэя ў Слоніме...

Сапраўдны унікум выставы — партрэтная галерэя роду. Усе 72 партрэты — ад Гедыміна і легендарнага Сунігайлы-Сямёна — прывезеныя ў Вільню з Кракава. Баракальная калекцыя партрэтаў — велічнае відовішча.

Выстава адбываецца пад ганаровым патранатам князя Міхала Сапегі, які жыве ў Бельгіі. На адкрыцці князь адзначыў, што пакідае гісторыкам ацэнку палітычнай дзейнасці Сапегаў: «Я ўсведамляю, што гэтая ацэнка не заўжды будзе карыснай». Але пасля Сапегаў засталася і багатая культурная спадчына, якой могуць ганарыцца народы ВКЛ і Рэчы Паспалітай.



**Герб «Ліс»**

У XVII—XVIII стст., падчас супрацьстаяння з Радзівіламі, быў складзены легендарны радавод Сапегаў. Нібыта пад імем Сямён хрысціўся троцкі кашталян Сунігайла, унук князя Нарымонта Гедымінавіча. Даследаванні гэтага не пацвярджаюць. Польскі гісторык Уладзіслаў Сямковіч дапускаў, што Сунігайлавічы, якія карысталіся гербам «Ліс», у 1434 прынялі ў гербавае брацтва Сапегаў.

Герб «Ліс» — двойчы перакрыжаваная срэбная страла ў чырвоным полі. «Лісам» ён завецца, бо кляйнот (геральдычнае завяршэнне шлема) у класічным варыянце герба — палова лісіцы. Апісанне герба стала родавым дэвізам Сапегаў: «Крыж азначае цноту, а страла — перамогу...»



**Радавод ад пісара Сямёна**

Род Сапегаў — са Смаленшчыны. Першым з Сапегаў вядомы Сямён, які ў 1440-я быў пісарам Казіміра Ягайлавіча. У войнах з Масквою ў 1500—1503 і 1512—1522 ВКЛ страціла тэрыторыі, дзе знаходзілася маёмасць баяраў Сапегаў, — Ельню, Гарадзішча, Апакаў. Але Сапегі прыдбалі праз службу і ўдалыя шлюбы новыя ўладанні. Сыны Сямёна Багдан і Іван — пачынальнікі галоўных ліній роду: старэйшай Чарэйскай—Ружанскай і малодшай Кодзенскай. Назвы пайшлі ад галоўных уладанняў — Чарэі пад Чашнікамі, Ружанаў пад Слонімам ды Кодня на Берасцейшчыне (сёння ў Польшчы).



**Сігнатура вялікага канцлера Льва Сапегі.**



**Унікум выставы — партрэтная галерэя роду »**

## Дашчэнту згарэла сядзіба О'Руркаў ва Уселюбе

Але нашчадак усё адно не адмаўляецца яе купляць.

8 мая, прыблізна а 6-й раніцы, у былой сядзібе графаў О'Руркаў, што ва Уселюбе Навагрудскага раёна, пачаўся пажар. «Калі мы прыехалі а 10-й раніцы, сядзіба яшчэ дагарала, — расказала дырэктар краязнаўчага музея Тамара Вяршыцкая. — Мы прыехалі туды разам з нашчадкам О'Руркаў, Алегам О'Руркам, які якраз хацеў вярнуць сабе сядзібу».

Самая верагодная версія здарэння — у былой сядзібе ночылі бамжы, якіх напярэдадні бачылі ў вёсцы. «Ад сядзібы не засталося нічога, — кажа спадарыня Вяршыцкая. — Ёсць адна сцяна, але з ёй ужо нічога не зробіш. Да драўлянай сядзібы была прыбудавана цагляная частка, сучасная, але і ў яе згарэў дах».

Сядзіба была выстаўленая на аўкцыён, але некалькі гадоў ніхто яе не купляў. Першапачатковы кошт складаў $10 тысяч.

Бізнэсовец Алег О'Рурк жыве ў Маскве. Ён лічыць сядзібу ва Уселюбе ўласнасцю сваёй сям'і, незаконна адабранай бальшавікамі ў 1939. Таму плаціць нават дзесяць тысяч даляраў за яе нашчадак не збіраўся. «Лепей укласці іх у рэстаўрацыю», — казаў ён. Ведучы перамовы з мясцовай уладай, О'Рурк затрымаўся ў Навагрудскім раёне на дзень пазней, чым меркаваў. У той апошні дзень перабывання, па фатальным збегу абставін, сядзіба і згарэла.

«Цяпер прададуць сядзібу за адну базавую», — пракаментаваў здарэнне О'Рурк. Ад сваіх намераў вярнуць сядзібу Алег О'Рурк не адмаўляецца і цяпер — ён хоча цалкам адрэстаўраваць яе, вярнуць першапачатковы выгляд.

Сядзіба была збудаваная ў XIX ст., калі графы О'Руркі атрымалі ва ўласнасць Уселюб. Ад XVIII ст. прадстаўнікі гэтага ірландскага роду служылі ў Расійскай імперыі.

ЮУ

## Уніяцкі святар на «Тытаніку»

Ёзас Мантвіла з Ліпска да апошняга падтрымліваў людзей падчас катастрофы.

Адным з трох прысутных на злашчасным караблі святароў быў айцец Ёзас Мантвіла з Літвы. Пра гэта паведаміла каталіцкая служба навінаў CAN. Айцец Ёзас нібыта меў права служэння ва ўсходнім абрадзе для грэка-каталікоў у Літве. Сцвярджаецца, што ён быў вымушаны пакінуць краіну праз пераслед расійскіх уладаў і эміграваць у ЗША. Таму ён і апынуўся на борце «Тытаніка», дзе загінуў, не пакінуўшы без духовай апекі людзей, якія танулі.

Паўстае пытанне: якое дачыненне гэта ўсё мае да Беларусі?

Пашукаўшы імя айца Ёзаса Мантвілы ў спісах клерыкаў рыма-каталіцкіх дыяцэзій на тэрыторыі сучасных Літвы, усходняй Польшчы і Беларусі (бо акрамя Холмшчыны толькі ў гэтых рэгіёнах можна казаць пра падпольных грэка-каталікоў у межах Расійскай імперыі), знаходзім, што ён нарадзіўся каля Марыямпаля і вучыўся ў Сейненскай семінарыі. Рукапакладзены на святара ў сакавіку 1908, ён быў прызначаны вікарным ксяндзом у Ліпску на Аўгустоўшчыне (цяпер Польшча).

Яшчэ Яўхім Карскі ў «Заметках по белорусским говорам» выразна далучае Ліпск да этнічных беларускіх земляў. Як піша гісторык Андрэй Вашкевіч у сваіх публікацыях на тэму беларускага грэка-каталіцтва на Аўгустоўшчыне, «за перыяд 1905—1913 у каталіцтва з праваслаўя ў Аўгустоўскім павеце Сувалкскай губерні перайшлі 16012 чалавек». Усе гэтыя людзі былі беларусамі ўніяцкага паходжання. Да таго ж, багата людзей на былых уніяцкіх землях папросту ігнаравала расейскую царкву і таемна прымала сакраманты хросту, шлюбу, споведзі ў рыма-каталіцкіх святароў. Сярод гэтых людзей у Ліпску і працаваў а. Мантвіла.

Няма вялікай пэўнасці, што святар меў права служыць ва ўсходнім абрадзе, бо атрымаць такі дазвол афіцыйна ва ўмовах царскай Расеі было амаль немагчыма. Тым не менш, будучы святаром, а. Ёзас напэўна не мог адмовіць беларускім сялянам-уніятам у духовай апецы.

Такім чынам, мы можам казаць і пра няхай сабе ўскосны, але беларускі ўніяцкі след на «Тытаніку» ў дадатак да раней вядомых беларускіх габрэйскіх і іншых слядоў.

Ігар Лабацэвіч, Мінеапаліс, ЗША

# Ноч музеяў

**Міжнародная акцыя «Ноч музеяў» пройдзе ў Мінску ў ноч з 18 на 19 мая.** Сталічныя музеі падрыхтавалі да гэтага свята адмысловыя культурныя праграмы.

**18 мая з 18.00 да 23.00 у Нацыянальным гістарычным музеі (Маркса, 12)** можна будзе не толькі пазнаёміцца з экспазіцыяй, але і прыняць удзел у забаўках. Госці змогуць павярнуць час на 200 гадоў назад і пабываць у эпосе напалеонаўскіх войнаў. Даведацца больш пра падзеі тых гадоў дапаможа выстава «Вайна 1812 года ў гісторыі Мінска» і праграма «Эпохі мімалётныя імгненні». Уваход сёлета будзе вольным.

**Нацыянальны мастацкі музей (Леніна, 20)** з 19.00 да 1.00 прапануе мінчукам і гасцям сталіцы прыняць удзел у акцыі «Апакаліпсіс. Адмяняецца... ». Такая незвычайная назва акцыі звязана з тым, што чалавецтва неаднаразова чакала канец свету. Задача музея — выкрыць гэтыя змрочныя чуткі, зрабіць мерапрыемства максімальна светлым і ажыўленым.

**Музей Янкі Купалы (парк Янкі Купалы)** запрашае жыхароў і гасцей сталіцы далучыцца да музейнага праекта «Паўлінка-NEXT». Музей будзе працаваць для наведвальнікаў з 18-й да 2-й.



PHOTO.BYMEDIA.NET

## СПОРТ

### Фінал Кубка Беларусі

**20 мая на стадыёне «Дынама»** за трафей пазмагаюцца «Нафтан» (Наваполацк) — «Мінск». Апроч Кубка, каманды разыграюць таксама пуцёўку ў Лігу Еўропы. Пачатак у 13:30 для зручнай тэлетрансляцыі.

### 11 тур

**У пятніцу 18 мая** скончаецца першае кола Чэмпіянату Беларусі па футболе. Сустракаюцца:
«Брэст» — «Мінск»;
БАТЭ (Барысаў) — «Славія» (Мазыр);
«Нёман» (Гродна) — «Гомель»;
«Дынама» (Мінск) — «Нафтан» (Наваполацк);
«Шахцёр» (Салігорск) — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).

### World Open Minsk — 2012

**19—20 мая на СКС «Арэна» (пр.Пераможцаў, 111)** пройдзе адкрыты чэмпіянат свету па бальных танцах World Open Minsk — 2012.
У спаборніцтве возьмуць удзел лепшыя танцавальныя дуэты больш чым з 15 краін свету, адбудуцца еўрапейская і лацінаамерыканская праграмы, спаборніцтвы ва ўсіх узроставых катэгорыях.

## ІМПРЭЗЫ

### Гальшанскі замак-2012

**26 мая а 10-й у Гальшанах** — адкрыццё фестывалю «Гальшанскі замак-2012», на якім вы зможаце наведаць шмат разнастайных пляцовак, а таксама пабачыць парад рэтра-машын. На працягу ўсяго фестывалю будзе праходзіць майстар-клас па танцах. Вы зможаце вывучыць старадаўнія народныя і сярэднявечныя танцы, а навучаць вас тэатральныя гурты «Яварына» і «Фламея». Таксама пройдуць рыцарскі турнір і турнір лучнікаў, конны турнір.

### Танцавальна-музычны марафон

**У Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь (зав.Музычны, 5) 19 мая** з 18-й да 23-й пройдзе «Танцавальна-музычны марафон». Наведвальнікі змогуць пазнаёміцца з танцавальнай культурай розных народаў свету і прыняць удзел у захапляючых майстар-класах. У праграме прадстаўлены: капаэйра, фламенка, грузінскія, ірландскія, усходнія, індыйскія, беларускія танцы. Уваход з маракасамі і кастаньетамі вольны.

### Мастацтва перфоманса

**19 мая а 16-й у бары «Ў» (пр. Незалежнасці, 37а)** Мішко Шувакавіч (Сербія) разважае аб «Мастацтве перфоманса і новых тэорыях мастацтва».

### Дзень адкрытых дзвярэй

**20 мая ўпершыню ў беларускіх аграсядзібах** будзе праведзены «Дзень адкрытых дзвярэй». У гэты дзень усе ахвотныя могуць наведаць любую аграсядзібу, пазнаёміцца з паслугамі, а таксама пакаштаваць гаспадарскія прысмакі і набыць сувеніры.



### Фэст Агню

**З 19 да 20 мая** на мінскім стадыёне «Трактар» пройдзе Фэст Агню. Вас чакаюць выступы найлепшых вогненных гуртоў з Беларусі, Украіны, Расіі і Літвы, пры падтрымцы музычных гуртоў Мінска. А апоўначы сваё майстэрства будуць дэманстраваць піратэхнічныя каманды Беларусі.

## КАНЦЭРТЫ

### Дзень народзінаў Аляксандра Кулінковіча

**24 мая 20-й у клубе «Гудвін» (пр.Незалежнасці, 19)** — дзень народзінаў Аляксандра Кулінковіча.

### Unplugged: гурты «Стары Ольса» і Guda

**20 мая а 18-й у «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — «Стары Ольса» і «Гуда».

### Akute

**18 мая а 19-й у «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт Akute.

### S°unduk

**17 мая а 20-й у Jack Club (Няміга,12)** — S°unduk (пры ўдзеле струннага квартэта Blansh).

### Юры Шатуноў

**19 мая ў КЗ «Мінск» (Кастрычніцкая, 5)** пройдзе канцэрт Юрыя Шатунова. Пачатак а 19.00.

## ВЫСТАВЫ

### Ad librum

**Да 18 мая ў «Кніжным салоне» (Калініна, 5)** працуе выстава ілюстрацыі дзіцячай кнігі Аксаны Аракчэевай Ad librum. У экспазіцыі — больш чым дваццацігадовая гісторыя ўзаемаадносінаў мастачкі з дзіцячай кнігай.

### Таямнічы і чароўны свет мінулага

**Да 31 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі** працуе выстава «Таямнічы і чароўны свет мінулага: Беларусь у легендах і паданнях».
На выстаўцы прадстаўлена звыш 300 дакументаў на рускай, беларускай і польскай мовах. Экспазіцыя складаецца з чатырох раздзелаў: «Фальклорная скарбніца» (здабыткі П.Шпілеўскага, П.Шэйна, Д.Бохана, А. Сержпутоўскага, М. Федароўскага і інш.), «Ад продкаў у спадчыну» — матэрыялы пра легенды і паданні, з якімі звязана паходжанне гарадоў і мястэчак, а таксама знакамітых гістарычных мясцін. Працягвае экспазіцыю раздзел «Маўклівыя сведкі прыроды». У заключным блоку экспазіцыі «Праз прызму мастацкіх твораў» прадстаўлены кнігі, у якіх пісьменнікі даюць паданню і легендзе другое жыццё.

### Юзаф Крашэўскі

**У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі (Сурганава, 15, інфармацыйна-выставачны цэнтр, пакой 110)** працуе выстава, прымеркаваная да 200-годдзя з дня нараджэння пісьменніка Юзафа Ігнацыя Крашэўскага. У «Кнізе рэкордаў Гінэса» ён адзначаны сярод «самых пладавітых аўтараў» як «чэмпіён эпохі гусінага пяра».

## ТЭАТРЫ

### 17 мая

**Беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»
**Оперы і балета** — «Чароўная флейта»

### 18 мая

**Оперы і балета** — «Лебядзінае возера»
**Беларускай драматургіі** — «Містар Розыгрыш»

### 19 мая

**Беларускай драматургіі** — «Ліфт»

### 20 мая

**Купалаўскі** — «Чорная панна Нясвіжа»

### 21 мая

**Купалаўскі** — «Не мой»

### 22 мая

**Беларускай драматургіі** — «Спектакль №7»

### 23 мая

**Беларускай драматургіі** — «Дарагая Алена Сяргееўна»
**Юнага гледача** — «Аднакласнікі»
**Купалаўскі** — «Паўлінка»

### 24 мая

**Купалаўскі** — «Ноч на Каляды»

### 25 мая

**Купалаўскі** — «Ноч на Каляды»
**Беларускай драматургіі** — «Дарагая Алена Сяргееўна»

### 26 мая

**Лялек** — «Кот у ботах»

### 27 мая

**Лялек** — «Вясёлы цырк»
**Оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»

## КІНО

### Упырскі бізнэс Джоні Дэпа

**Змрочныя цені** (Dark Shadows)
ЗША, 2012, каляровы, 113 хв.
**Рэжысёр:** Цім Бёртан
**Ролі выконваюць:** Джоні Дэп, Ева Грын, Мішэль Пфайфер, Хлоя Морэц, Джоні Лі Мілер, Бэла Гіткоўт, Хэлена Бонэм-Картэр
**Жанр:** Гатычная камедыя
**Адзнака:** 5 (з 10)

Барнабас Колінз багаты і прыгожы. Калі ён спакусіў служанку, помслівая жанчына звяла чорнай магіяй яго бацькоў і нявесту, а самога лавеласа зрабіла вампірам і пахавала. Праз два стагоддзі Барнабас вызваліўся, з нястомнай прагай абараняць свой бізнэс, сваю сям'ю і асабліва маладзенькую гувернантку, якая нагадвае вампіру нявесту. Але ведзьма Анжэліка таксама не спіць у шапку.

Майстар змрочных казак Цім Бёртан распавядае сямейную мыльную оперу, дзе ў кожнага свае прусакі ў галаве. Бледнатварны Джоні Дэп сядзіць на адмысловай дыеце, рудая псіхіятарка-алкагалічка прагне вечнай маладосці (Хэлена Бонэм-Картэр), а хлопчык блукае з падключаным да яго прывідам. Гатычны вукар вучыцца ў хіпароў правілам моднага спакушэння і паліць з імі марыхуану.

У фільме Бёртана шмат цікавага, а пачуццё чорнага гумару ніколі рэжысёра не падводзіла.

**Андрэй Расінскі**



# Трэцякурсніца атрымала 50 тысяч даляраў на хостэл

**Бізнэс-план** ёй дапамог распрацаваць яе ж выкладчык па эканоміцы.



Ксенія Курусь.

Вечарынкі з глінтвейнам, кінапаказы пад адкрытым небам

**Стартап**
новы бізнэс, які шукае наватарскую ідэю.

Студэнтка трэцяга курса Беларускага інстытута правазнаўства Ксенія Курусь распрацавала праект пабудовы сеткі моладзевых хостэлаў па ўсёй Беларусі. І атрымала праз конкурс стартапаў фінансаванне ў 50 тысячаў даляраў на свой першы хостэл у Мінску.

У студзені 2012 Ксенія Курусь прыйшла на конкурс стартапаў Startupweekend і расказала пра сваю ідэю экспертам і інвестарам. Дзяўчыну не спыніла, што мерапрыемства было для камп'ютарных праектаў. Як вынік 12 мая ў Мінску адкрываецца хостэл для вандроўнікаў Traveler.

«Захацелася стварыць сапраўдны еўрапейскі хостэл, каб турысты, якія не могуць дазволіць сабе гатэль, мелі магчымасць спыніцца там, прыемна бавіць там час, адпачыць, пазнаёміцца, зайсці ў інтэрнэт... увогуле, каб склалася добрае ўражанне», — кажа Ксенія.

Студэнтка кажа, што бізнэс-план ёй дапамог распрацаваць яе выкладчык па эканоміцы, а грошы на яго рэалізацыю дзяўчына шукала ўжо цэлы год.

«За мой праект прагаласавалі [на конкурсе стартапаў — «НН»], і ўжо на наступны дзень я размаўляла з інвестарам Аляксандрам Кныровічам, паказала яму бізнэс-план». Гэты ж інвестар у выніку прапанаваў студэнтцы грошы на адкрыццё першага хостэла на 40 чалавек у сталіцы.

«Мы пастараліся зрабіць усё магчымае, каб забяспечыць максімальна камфортныя ўмовы пражывання, прыдумалі шмат розных «фішак». У нас пастаянна будуць праходзіць розныя мерапрыемствы, — расказвае Ксенія. — Напрыклад, вечарынкі з глінтвейнам, кінапаказы пад адкрытым небам. Кліенты змогуць карыстацца Wi-Fi і бясплатнымі нэтбукамі, гульнявымі прыстаўкамі X-Box, будзе па 2 ванныя пакоі на паверсе».

Суткі пражывання ў хостэле будуць каштаваць $15. Для спартыўных камандаў або вялікіх турыстычных груп, а таксама для ўладальнікаў міжнародных карт ISIC будуць зніжкі. Traveler — не першы хостэл у Мінску. Сярод іншых праектаў існуе нават план пабудовы хостэла БРСМ у сталіцы.

**Generation.by**

Аўто

## Топ-10 найлепшых машын усіх часоў і народаў

Знакаміты амерыканскі часопіс для мужчын Playboy абраў «найлепшыя аўтамабілі ўсіх часоў» з эстэтычнага і тэхнічнага пункта гледжання і з улікам рарытэтнасці мадэлі. У рэйтынг трапілі машыны, выпушчаныя пасля 1940 года, коштам ад $7 тысяч да $35 мільёнаў.

Першае месца ў рэйтынгу Playboy заслужана дасталася легендарнай мадэлі Ferrari GTO (250 GTO), якая з'явілася ў пачатку 1960-х гадоў і была выпушчаная тыражом усяго 39 штук. Другое месца дасталася Porsche 911, трэцяе — Shelby Cobra.

**Playboy**

**У дзясятку найлепшых трапілі:**

1. Ferrari GTO



2. Porsche 911



3. Shelby Cobra



4. Jaguar E-Type
5. Mercedes-Benz Gullwing
6. McLaren F1
7. Chevrolet Corvette
8. Aston Martin DB5
9. Lamborghini Miura
10. BMW 507

Ідэі

## Як назваць аквапарк?

Пераможца конкурсу атрымае **бестэрміновы абанемент** на дзве персоны.

Першы ў сталіцы аквапарк аб'яўляе конкурс на найлепшую назву забаўляльнага комплексу. Свае прапановы можна дасылаць на адрас: праспект Ракасоўскага, 44, Мінск, 220095, з паметкай «Аквапарк», а таксама на электронны адрас office@fs.by.

Пераможца будзе абвешчаны 1 чэрвеня — у Міжнародны дзень абароны дзяцей. Шчасліўчык атрымае бестэрміновы абанемент у аквапарк на дзве персоны.

Што тычыцца самога аквапарку, то яго адкрыццё намечана на сакавік 2013. Комплекс размесціцца ў раёне праспекта Пераможцаў на тэрыторыі, прылеглай да вадасховішча Дразды. Па сваёй велічыні аквапарк стане пятым у Еўропе. Улетку яго адначасова змогуць наведваць 7,8 тысячы чалавек, у халодны час года — 6,7 тысячы.

**Vminsk.by**

Тэхналогіі

## Паказанні лічыльнікаў вады праз SMS

Мінскія камунальшчыкі ўвялі **новую паслугу**.

Цяпер жыхары сталіцы могуць перадаваць паказанні лічыльнікаў уліку вады з дапамогай SMS.

У тэксце паведамлення трэба ўказаць адрас, прозвішча і ініцыялы, апошнія паказанні лічыльнікаў, а таксама расход халоднай і гарачай вады. Напрыклад: «вул. Багдановіча, д.78, кв.10 / Гвозд П.І. / х.в. — 50, расход — 3 м³ / г.в. — 30, расход — 1,2 м³».

Нумары тэлефонаў, па якіх можна адправіць SMS-паведамленне, ужо размешчаныя на сайтах ЖРЭА, таксама іх можна даведацца ў разліково-даведачных цэнтрах.

**Open.by**

Сцісла

### Пашпарты будуць выдавацца ў 14 гадоў

Раней яны выдаваліся ў 16 гадоў і іх трэба было мяняць у 25 гадоў і 45 гадоў. Цяпер тэрмін дзеяння пашпартоў складзе ўсяго дзесяць гадоў.

### У Беларусі збіраюцца забараніць курэнне ў рэстаранах і на вакзалах

Міністэрства аховы здароўя рыхтуе прапановы аб больш жорсткай забароне на курэнне ў грамадскіх месцах. У дакуменце, накіраваным у Савет Міністраў, прапануецца вызваліць ад тытунёвага дыму ўстановы аховы здароўя, адукацыі, спорту, аб'екты грамадскага харчавання, вакзалы, а таксама вагоны цягнікоў.

**ЯМ**

### Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Віншуем Сямёна і Таццяну Печанко**, у якіх нарадзіўся сын Сямён! Хай расце на радасць бацькам. Нашаніўцы

**Віншуем Алега і Санду Латышонкаў** з нараджэннем сына Клімента. Сябры

**АДДАМ**

**Аддам** у добрыя рукі час. «Архэ» за 2009—2010 гг. Т.: (044)777-72-48. Алесь.

**ПРАЦА**

**Прыватная беларускамоўная кампанія** шукае вэб-праграміста на няпоўную працоўную стаўку. Мінімальныя патрабаванні: веданне беларускай мовы, выдатнае веданне сваёй справы і вопыт працы. Прапановы накіроўваць на jascanka@gmail.com.

**Hostel «JAZZ»** возьме на працу адміністратараў (hosteljazz.by). Заробак 1,5–2,5 млн рублеў. Валоданне беларускай, расейскай, ангельскай абавязковае. Кантактная асоба: Уладзімір Рамановіч (vladi_r@tut.by), ТТА «Панскі дом» ці праз тэл. (029) 701-61-83.

**ДАПАМОГА**

**Наста Азарка з Нясвіжа** — у мінулым асуджаная па крымінальнай справе Маладога Фронту — сама гадуе дзіця. Цяпер самы цяжкі момант для Насты Азаркі: дачка яшчэ замалая, каб мама магла падпрацоўваць. У той жа час гэта самыя цяжкія месяцы з пункту гледжання фізічнай і псіхалагічнай нагрузкі на маму. Будуць рэзацца зубкі, а запас сілаў маладой мамы — усё меншы.

Таму ад сяброў Насты просьба: калі ласка, хто можа, дапамажыце Насце зараз. Адзежы ёй наадавалі досыць, але трэба грошы. Хто можа, зрабіце ёй грашовыя пераводы. Вось паштовы адрас, пераводы можна зрабіць на кожнай пошце: Азарка Настасся Аляксандраўна. 222621 Нясвіжскі раён, вёска Рудаўка вул.Юбілейная 6-3. Сябры

**СПАЧУВАННІ**

**Спачуванні** дзецям Таццяны Піліпаўны Пархімчык, што адышла ў лепшы свет. Унукі.



АНТОН МАТОЛЬКА

**«Міс грудзі — 2012» — выкладчыца БНТУ з 6-м памерам грудзей. 23-гадовая Юлія выкладае электраправоднасць, але марыць адкрыць салон кветак. Конкурс прайшоў у начным клубе Dozari. На фота: пераможца справа.**



**Аўтобус з жаночай зборнай Беларусі па баскетболе, які накіроўваўся ў Літву (Друскенікі) на зборы, трапіў у аварыю. «У наш аўтобус урэзаўся «Опель», кіроўца якога заснуў за рулём», — напісала на сваёй старонцы ў Facebook цэнтравая зборнай Марына Крэс. У аварыі ніхто не пацярпеў.**



**Знік хлопец з Вілейкі. Гэта адбылося 9 мая пасля абеду ў вёсцы Цэль Асіповіцкай раёна. Да гэтага часу пра месцазнаходжанне Уладзіміра нічога невядома. Калі хто-небудзь што-небудзь бачыў або чуў, адгукніцеся. Тэлефануйце на нумар (29) 504-46-24 (Дзяніс).**



Raguin Vitaliy | dervishv.livejournal.com

**Твітар-рэвалюцыя ў Маскве. Пратэстоўцы разбілі на Чыстых Прудах намётавы гарадок, дзе начуе штодня 500 чалавек.**



**Цікавая тэхналогія вырошчвання клубніц у Нямеччыне.**

## Анекдоты

* * *

Антось ужо паўтара года хацеў расстацца з Марынай, але Марынка была чэмпіёнкай Магілёва па каратэ і таму сама вырашала, калі і з кім расставацца.

* * *

Тэрмін сканчэння прыдатнасці ёгурту — гэта калі біфідабактэрыі пераходзяць на бок Сілаў Зла.

* * *

Ішоў калабок з лесу, нёс кошык з грыбамі. Пераходзіў дарогу, трапіў пад каток... Вось так, дзеткі, і прыдумалі піцу з грыбамі.

* * *

Сезон «Па табе нешта паўзе» абвяшчаецца адкрытым.

* * *

Вось што значыць сэнсарны тэлефон... Котка, абнюхваючы яго, зрабіла 3 здымкі, адправіла 5 SMS і выклікала нарад міліцыі.

* * *

Суддзя, перад тым як пасадзіць бульбу, зачытвае ёй прысуд.

* * *

Над Мінскам разагналі аблокі, 30 аблокаў затрыманыя і дастаўленыя ў РУУС.

* * *

Выступаючы з пасланнем перад дэпутатамі, Лукашэнка закрануў і тэму будучых парламенцкіх выбараў. Ён сказаў, што коней на пераправе не мяняюць. Дэпутаты задаволена заржалі.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Вялікая Раёўка.** Слуцкі павет. Беларусы тутэйшыя проста беларусы. Дай Бог, каб старонка наша толькі і красавалася такімі людзьмі. Ні ў воднай вёсцы так не шануюць роднай мовы, як тут. Тут смяюцца з таго, хто калечыць яе, ламаючы на польскую ці расейскую. Дзяўчаты свайго роднага не пакідаюць, а стараюцца болей украсіць яго.

**«НН». №18. 1912.**

**Судовая перамога «НН».** Вышэйшы гаспадарчы суд адмяніў папярэджанне, вынесенае «Нашай Ніве» пракуратурай. Парушэнні былі знойдзены пракуратурай за згадку пра аўтакефальную праваслаўную царкву, за распаўсюд інфармацыі ад імя незарэгістраванай грамадскай арганізацыі.

**«НН». №18. 2002.**

Наша Ніва

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
намеснік галоўнага рэдактара — Зміцер Панкавец
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Мінск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32,
8-029-707-73-29.
E-mail: nn@nn.by
On-line: www.nn.by

**Падпісны індэкс:**
індывідуальны — **63125**
для прадпрыемстваў — **631252**

© НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 8003. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 15.05.2012.
Замова № 2101.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12